*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 студзеня 2014 г. СУБОТА № 1 (27611) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ДУХОЎНАЯ СІЛА ВЯЛІКАГА СВЯТА

### ПРАВАСЛАЎНЫМ ХРЫСЦІЯНАМ БЕЛАРУСІ

*Дарагія суайчыннікі!*

*Віншую вас з Раством Хрыстовым.*

*Для мільёнаў людзей Раство стала сімвалам далучэння да нязменных каштоўнасцяў хрысціянскага жыцця і духоўнасці. У складаным сучасным свеце не згасаюць веліч і ўзвышанасць хвалюючай урачыстасці, што нясе ўпэўненасць у перамозе ідэалаў гуманізму і справядлівасці.*

*Раство Хрыстова ўсяляе ў сэрцы надзею і ўсёабдымную любоў, напаўняе жыццё шчырай радасцю і добрымі спадзяваннямі. Недарма калядныя дні — гэта час здзяйснення жаданняў, дабрачыннасці і міласэрнасці, асаблівай увагі да ўсіх, хто мае патрэбу ў нашай спагадзе, клопаце і дапамозе.*

*Раство аб'ядноўвае сем'і, дорыць цудоўны настрой, прыносіць мір і згоду ў кожны дом. Няхай цяпло любові і дружбы не пакідае вас і вашых родных, а духоўная сіла вялікага свята дапамагае ў рэалізацыі самых смелых пачынанняў.*

*Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, аптымізму, шчасця і дабрабыту.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# МІРУ, ДАБРА, ЛЮБОВІ

### НАВАГОДНЯЕ ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АЛЯКСАНДРА РЫГОРАВІЧА ЛУКАШЭНКІ БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ

Дарагія суайчыннікі!

Самае неацэннае багацце ў нашым з вамі жыцці — гэта час. У такія моманты, як цяпер, калі адзін год змяняе другі, мы асабліва моцна адчуваем, наколькі няўмольны яго бег і як важна ў жыццёвай мітусні не ўпусціць галоўнае — дом, сям'ю, душэўнае цяпло тых, хто нам дарагі.

Насуперак прыкметам трынаццаты год новага стагоддзя не стаў нешчаслівым. Кожны з нас можа ўспомніць самыя значныя для яго падзеі і сустрэчы. Падзякаваць лёсу за мінуты, гадзіны і дні, якія далі магчымасць адчуць радасць і паўнату быцця.

Мы пражылі гэты год на адным дыханні, як адзіная вялікая сям'я. Кожны з нас адчуваў сябе неад'емнай часткай вялікага і гордага цэлага, імя якому Беларусь.

Мы сэрцам адчулі гэта яднанне ў мінуты прынясення свяшчэннай клятвы на плошчы Дзяржаўнага сцяга.

Мы зрадніліся з гэтым пачуццём і часам нават не ўсведамляем, якое гэта на самай справе вялікае, неацэннае шчасце — жыць на сваёй зямлі, свабодна дыхаць яе паветрам, піць яе крыштальную ваду і адчуваць сябе адначасова яе любімым сынам і дбайным гаспадаром. І ведаць, што над табой не ўладарыць ніхто, акрамя твайго розуму і твайго сумлення.

Тое, што гэта шчасце ў нас ёсць, што нам удалося адстаяць яго, напаўняе нашы сэрцы ўпэўненасцю і надзеяй.

У кожнага, кім бы мы ні былі — дзецьмі або дарослымі, багатымі або не вельмі, маладымі або пажылымі, ёсць адзіны бясцэнны здабытак. Гэта наша краіна, Беларусь — цёплы, абжыты і ўтульны дом, які мы павінны перадаць новым пакаленням бяспечным і абавязкова паспяховым.

Не заўсёды было лёгка і проста, і не ўсё, што мы планавалі, збылося. Але ўсё ж такі нам гэты год больш запомніцца падзеямі, якія пакінулі добры след у гісторыі.

Мы непасрэдна падышлі да паспяховага вырашэння дэмаграфічнай праблемы. Упершыню пасля 1990 года забяспечаны прырост насельніцтва краіны. Дадзены старт суперінавацыйнаму праекту — будаўніцтву Беларускай атамнай электрастанцыі. Сабраны першы 450-тонны БелАЗ-гігант.



Фота БЕЛТА.

Мы пабудавалі больш за 5 мільёнаў квадратных метраў жылля. Наш экспарт прадуктаў харчавання ўпершыню перасягнуў 5 мільярдаў долараў.

У адыходзячым годзе мы сталі багацейшымі і ў простым чалавечым шчасці. У Беларусі згуляна на 10 тысяч больш вяселляў і нарадзілася амаль на 4 тысячы больш дзяцей, чым у 2012 годзе.

Таму наша краіна ўпэўнена ўваходзіць у лік 50 дзяржаў — лідараў па індэксе чалавечага развіцця ў сусветным рэйтынгу Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Напэўна, камусьці з нас пашанцавала больш, камусьці — менш. Аднак цяпер, чакаючы бой гадзінніка, мы спадзяёмся, што новы год будзе больш шчодры і больш паспяховы, чым стары, і ўсё ў нас атрымаецца.

Але, вядома ж, загадваючы жаданні і строячы планы, мы павінны разумець: калі ў мінулым годзе мы не дабіліся чагосьці, значыць, самі не вельмі стараліся і намагаліся. Значыць, самі вінаватыя. А ўсе добрыя змены адбудуцца, толькі калі мы ўкладзём у іх сваю працу і розум.

Трэба будзе прыкласці максімум намаганняў, каб не разгубіць дасягнутае, рушыць наперад, разлічваючы ў першую чаргу на ўласныя сілы і ўнутраныя рэзервы, якія трэба ўмела выкарыстоўваць.

Закон жыцця просты — усё, што дастаецца дарма, знікае, як пясок скрозь пальцы. Надзейна толькі тое, што здабыта сумленнай і руплівай працай.

Паважаныя сябры!

Беларусь называюць краінай добрых людзей. Справа гонару для кожнага з нас праявіць свае душэўныя якасці ў надыходзячым Годзе гасціннасці.

Усім разам трэба пранікнуцца пачуццём адказнасці за чысціню і ўтульнасць, за ветлівасць у абыходжанні, за дабрабыт роднай зямлі, навучыцца дапамагаць адзін аднаму, і асабліва — дзецям і старым. Стаць больш чулымі, клапатлівымі, уважлівымі і міласэрнымі, памятаючы, што кожнае імгненне жыцця бясцэннае і непаўторнае.

У гэтыя ўрачыстыя мінуты я хачу сказаць добрыя словы кожнаму з вас. Павіншаваць нашых бацькаў і маці, братоў і сясцёр, дзяцей і ўнукаў.

Асаблівая ўдзячнасць, вядома ж, нашым любімым і любячым жанчынам, якія ахоўваюць наш мужчынскі спакой. Вы дорыце нам добры настрой, сілы, жаданне ісці наперад, ствараць і мяняць да лепшага наша жыццё.

У гэты цудоўны святочны вечар хочацца сказаць самыя добрыя словы нашым настаўнікам і ўрачам — захавальнікам нашых душ і сэрцаў, чые мудрасць і клопат даруюць нам веды і здароўе.

Нашым вучоным, дапытлівы розум якіх абнаўляе і змяняе свет.

Нашым спецыялістам, рабочым, будаўнікам, нашым сялянам, рукамі якіх ствараецца наш матэрыяльны дастатак і дабрабыт.

Людзям у пагонах, якія ахоўваюць мір, закон і парадак.

Усім, хто ўносіць сваю лепту ў будаўніцтва нашага агульнага беларускага дома.

Давайце ў наступным годзе будзем цаніць і берагчы адзін аднаго, падаючы прыклад нашым дзецям. Бо свет стаіць не на сланах і кітах, як думалі ў старажытнасці. І не на грашах, як некаторыя думаюць цяпер. Ён спрадвеку стаяў і трымаецца цяпер на любові і клопаце. І навагодняя ноч — самы час успомніць аб гэтым.

Міру, дабра і любові вам, дарагія сябры!

З Новым годам!

# КАЛЯДНЫ ДАБРАВЕСТ



*Фотарэпартаж з Каляднай выставы глядзіце на 6-й стар.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

## ***На 18,1%***

***павялічылася рэальная заработная плата работнікаў Мінска (заработная плата, разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ) у студзені-лістападзе 2013 года ў параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года. Пры гэтым самая высокая сярэднямесячная заработная плата была ў арганізацыях, звязаных з вылічальнай тэхнікай (Br13 млн 104,9 тыс.) і паветранага транспарту (Br10 млн 553,4 тыс.). Стабільна высокай застаецца аплата працы работнікаў будаўніцтва. Іх сярэднямесячная заработная плата (Br8 млн 163,4 тыс.) перавысіла паказчыкі ў сярэднім па горадзе на 24,5%. Ніжэй, чым у сярэднім па горадзе, склалася сярэднямесячная зарплата ва ўстановах адукацыі (Br4 млн 138,4 тыс.) і аховы здароўя (Br4 млн 565,8 тыс.).***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.01.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9520,00 | ▲ |
| Еўра | 13000,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 287,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1155,34 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +4° |
| Віцебск | +2° |
| Гомель | +2° |
| Гродна | +3° |
| Магілёў | +2° |
| Мінск | +1° |

■ Надвор'е

## АДЛІГА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

І ў першую дэкаду новага года тэрыторыя Беларусі застанецца пад уплывам малаактыўных атмасферных франтоў, якія рухаюцца да нас з боку Заходняй Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Уначы на нядзелю ў асобных раёнах, а ўдзень амаль паўсюдна пройдзе мокры снег і дождж. На працягу сутак месцамі туман і галалёд. Уначы ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 0–6 цяпла. 6 студзеня чакаецца дождж, а 7 студзеня дождж толькі месцамі. Туман і месцамі слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак — 0–4 цяпла, удзень ад 1 да 6 цяпла. У аўторак уначы — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень чакаецца 1–6 цяпла, па Брэсцкай вобласці — да плюс 8 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Падтрымка

# МІЛАСЭРНАСЦЬ НЕ МОЖА БЫЦЬ «АДНАРАЗОВАЙ»

**Якім быў мінулы год? Мы вырашылі спытаць аб гэтым у людзей, якія так ці інакш — па працы альбо па загадзе сэрца — амаль штодня сутыкаюцца з самымі безабароннымі, з тымі, каму ўвесь час патрэбна дапамога.**

**Ганна ГАРЧАКОВА, дырэктар Беларускага дзіцячага хоспіса:**



— Год быў няпростым і вельмі бурным. Мы пачалі будаваць новы корпус. Сышлі некаторыя людзі, якія шмат зрабілі для хоспіса, і прыйшло шмат новых.

Мы пачалі актыўна праводзіць мерапрыемствы па зборы сродкаў. Нягледзячы на тое, што над гэтай праблемай шмат гадоў працуюць дзяржаўныя, грамадскія арганізацыі і сродкі масавай інфармацыі, наша грамадства не гатова прымаць дзяцей-інвалідаў як роўных сабе. Вядома, пальцамі на іх ужо не паказваюць — і гэта добра. Але пачуццё няёмкасці, калі побач знаходзіцца дзіця ў інвалідным крэсле, у многіх засталося. Людзі не ведаюць, як сябе паводзіць, і ствараюць «вакуумную капсулу» вакол такога дзіцяці і яго маці, такое напружанае поле... Яно нікуды не дзелася, і нам трэба будзе яшчэ шмат працаваць у гэтым кірунку.

СТАР. 2

# ЗАРПЛАТА-2014: ЧАКАЕЦЦА РОСТ

**Першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Пётр ГРУШНІК расказаў, якія зарплаты нас чакаюць сёлета.**

## У бюджэтнікаў — сур'ёзная мадэрнізацыя сістэмы аплаты працы

Цяпер сістэма аплаты працы ў бюджэтнай сферы з'яўляецца цэнтралізаванай і заснавана на тарыфнай стаўцы першага разраду і надтарыфнай часткі ў залежнасці ад унутраных дакументаў, якія прымаюцца галіновымі міністэрствамі і рэспубліканскімі органамі дзяржкіравання.

Суадносіны заработнай платы бюджэтнікаў з яе ўзроўнем у цэлым па рэспубліцы складаюць 73,5%.

СТАР. 2

# ХРЫСТОС НАРАДЗІЎСЯ! — БОГ УЦЯЛЕСНІЎСЯ!

### ПАСЛАННЕ ДА РАСТВА ХРЫСТОВАГА МІТРАПАЛІТА ФІЛАРЭТА, ГАНАРОВАГА ПАТРЫЯРШАГА ЭКЗАРХА ЎСЯЕ БЕЛАРУСІ

Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

Вітаю вас гэтым святочным воклічам, у якім мы выказваем нашу радасць сустрэчы з Богам і надзею на перамяненне ўсяго нашага жыцця ў Хрысце!

*Бог — гэта любоў* (1 Ін. 4: 16). Магчыма, гэта самыя каштоўныя словы Святога Евангелля. Праз іх мы пазнаём пра адносіны Бога Айца, Сына і Святога Духа, а таксама і пра тое, што гэтая спрадвечная любоў неабыякавая да нас, людзей, якія жывуць на зямлі.

Кожны з нас укладае ў паняцце «любоў» свой сэнс. Ёсць сярод нас і тыя, каго жыццёвыя абставіны паставілі на мяжу расчаравання ў гэтым высокім пачуцці.

СТАР. 2



## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА ПЛАНЕТЫ СКЛАЛА 7 МЛРД 137 МЛН ЧАЛАВЕК



Колькасць насельніцтва планеты на 1 студзеня склала 7 млрд137 млн 577 тыс. 750 чалавек, падлічыла Бюро перапісу ЗША. За год на Зямлі стала на 77 млн 630 тыс. 563 чалавекі больш (рост на 1,1%). Найбольшы прырост за названы перыяд забяспечыла Індыя — 15,6 млн чалавек. Яна абагнала Кітай, Нігерыю, Пакістан і Эфіопію. Мяжа ў 7 млрд была пройдзена ў 2012-м. А да 2025 года насельніцтва планеты, як чакаецца, дасягне 8 млрд чалавек.

### ЖЫХАРЫ ЛАТВІІ РАЗВІТВАЮЦЦА З ЛАТАМ І СКАРДЗЯЦЦА НА ПАВЫШЭННЕ ЦЭН

З 1 студзеня Латвія афіцыйна ўступіла ў еўразону. Яна стала васямнаццатым членам групы, якая аб'ядноўвае краіны Еўрасаюза, чыёй афіцыйнай валютай з'яўляецца еўра. На працягу першых двух тыдняў пасля ўступлення ў еўразону ў Латвіі будзе дзейнічаць пераходны перыяд — расплачвацца можна і латамі, і еўра, але рэшта будзе выдавацца толькі ў еўра. Затым латы будуць выведзены з абарачэння.

Рашэнне аб уступленні ў зону еўра ўрад і парламент Латвіі прынялі нягледзячы на адсутнасць падтрымкі з боку насельніцтва рэспублікі. Паводле апытання, якое ў снежні правяла кампанія SKDS, толькі 8% жыхароў краіны цалкам падтрымалі пераход на еўра, 16,5% апытаных хутчэй падтрымалі. Супраць увядзення адзінай еўрапейскай валюты выказаліся 50% жыхароў рэспублікі.

Цяпер Цэнтр абароны правоў спажыўцоў Латвіі атрымлівае ад жыхароў шмат скаргаў у сувязі з пераходам на еўра, паведаміла ў інтэрв'ю перадачы тэлеканала LNT «900 секундаў» яго кіраўніца Байба Вітоліня. Паводле яе слоў, да гэтага часу Цэнтр абароны правоў спажыўцоў атрымаў ужо ўтрая больш скаргаў, чым было атрымана ў Эстоніі за ўвесь перыяд з часу ўвядзення еўра 1 студзеня 2011 года.

Часцей за ўсё латвійцы скардзяцца на павышэнне цэн, няправільнае канвертаванне валют і адсутнасць указання цэн у дзвюх валютах — еўра і латах. Праверкі паказалі, што гэтыя скаргі пераважна абгрунтаваныя — парушэнні выкрытыя ў 78% выпадкаў.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### НЕ САМЫЯ ВІДАВОЧНЫЯ РЭЧЫ, ЯКІЯ ПАЛЯПШАЮЦЬ ЗДАРОЎЕ

Як піша The Herald Sun, першы пункт — відэагульні. Яны падтрымліваюць работу мозга пажылых людзей, паляпшаючы кагнітыўныя функцыі, кароткатэрміновую памяць і здольнасць факусіраваць увагу.

Групавыя спевы даюць пачуццё яднання, высветлілі шведскія спецыялісты. Гэта адбіваецца на рытме сэрцабіцця членаў хору — ён сінхранізуецца з рытмам музыкі. А кантроль над дыханнем, неабходны падчас спеваў, выдатна супакойвае і падобны па эфекце на заняткі ёгай.

Песімізм можа адштурхнуць людзей, але ён падаўжае жыццё, заяўляюць нямецкія навукоўцы. Аказалася, людзі, якія пераацэньвалі ўзровень свайго дабрабыту, за 5 гадоў даследавання на 10% часцей паміралі або станавіліся недзеяздольнымі. Песімісты ж паводзілі сябе больш асцярожна, сачылі за здароўем.

Парацэтамол, акрамя абязбольвальнага эфекту, супакойвае, даказаў Універсітэт Брытанскай Калумбіі. Аказваецца, актыўны інгрэдыент лекавага сродку — ацэтамінафен — зніжае ўзровень дэпрэсіі і трывогі.

КОРАТКА

«Нафтан», Мазырскі НПЗ і «Беларуськалій» па выніках студзеня-верасня 2013 года сталі самымі прыбытковымі акцыянернымі таварыствамі.

За мінулыя святочныя дні 1 і 2 студзеня на дарогах краіны ў стане алкагольнага ап'янення затрыманы 281 вадзіцель.

Пункты абслугоўвання кліентаў электроннай сістэмы збору платы за праезд па аўтадарогах Беларусі BelToll 6 і 7 студзеня будуць выхаднымі. 4, 8 і 11 студзеня кліентаў плануецца абслугоўваць з 9.00 да 18.

Музей Багдановіча далучаць да Музея гісторыі беларускай літаратуры да 1 красавіка 2014 года. Раней апошнім тэрмінам рэарганізацыі называлася 31 снежня 2013 года, але ёсць яшчэ шмат пытанняў па працоўным заканадаўстве.

З 1 студзеня ўстаноўлены новы памер мінімальнай заработнай платы — Br1 млн 660 тыс., пагадзінная мінімальная заработная плата — Br9 тыс. 890.

Пераможца беларускага адбору міжнароднага песеннага конкурсу «Еўрабачанне-2014» у якасці прыза атрымае стылізаванае еўравізійнае сэрца. Спецыяльную ўзнагароду вырабляе шклозавод «Нёман» па заказе Белтэлерадыёкампаніі.

# ТАЯМНІЦА НАВАГОДНЯЙ НОЧЫ

У той хвалюючы момант, калі гадзіннікі адлічвалі апошнія хвіліны адыходзячага года, у сталічнай радзільні №1 на свет з'явіўся хлопчык. Першае немаўлятка святочнай ночы ў гэтай медыцынскай установе стала сапраўдным навагоднім падарункам для мінчанкі Вольгі Мікульчык.

— Мы збіраліся з мужам да бацькоў за горад, каб там сустрэць Новы год. Але давялося хутчэй ехаць у радзільнае аддзяленне, — распавядае шчаслівая матуля. — Прыехаўшы сюды, ужо праз гадзіну я нарадзіла. Дзякуючы медыкам роды прайшлі лёгка.

У першы дзень новага года ў гэтым аддзяленні з'явілася яшчэ чацвёра немаўлят (яны нарадзіліся ўдзень і ўвечары), але пад бой курантаў выпала нарадзіцца толькі Цімуру Мікульчыку — так назвалі хлопчыка. Ён — другі сынок у сям'і, нарадзіўся з класічнымі параметрамі — вагою 3 кілаграмы 680 грамаў і ростам 54 сантыметры. Дарэчы, свайго першага сына Вольга нарадзіла таксама ў гэтым радзільным аддзяленні, але два гады таму.

Па Мінску, акрамя Мікульчыка, у навагоднюю ноч нарадзілася 10 дзяцей. А на працягу першых сутак 2014 года — 39 немаўлят.

*На фотаздымку:* Вольга Мікульчык з сынам Цімурам, яе віншуюць намеснік галоўнага ўрача па родадапамозе Мінскай гарадской бальніцы №1 Элеанора Фядотава, урач акушэр-гінеколаг Аляксандра Домнікава і загадчык аддзялення Святлана Стасевіч.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



# ХРЫСТОС НАРАДЗІЎСЯ! — БОГ УЦЯЛЕСНІЎСЯ!

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Але вось сёння ў яслях перад намі ляжыць Богадзіця Хрыстос. Услед за евангелістам Іаанам нашы здзіўленыя сэрцы шэпчуць: *І Слова стала плоццю, і жыло сярод нас, поўнае благадаці і ісціны* (Ін. 1: 14).

Гэтае здзіўленне нараджае ўзнёслае славаслоўе: *Слава ў вышніх Богу, і на зямлі мір, у людзях добрая воля* (Лк. 2: 14)! Гасподзь, Які дзве тысячы гадоў назад змясціўся ў Віфлеемскіх яслях, цяпер нараджаецца ў нашых сэрцах. І тады ўслед за здзіўленнем і захапленнем да нас сыходзіць упэўненасць у тым, што любоў існуе, таму што вось Ён, уцялеснены Бог, вось яна перад намі, любоў, пра якую апостал Павел кажа: *сукупнасць дасканаласці* (Кал. 3: 14). Яна старэйшая і глыбейшая за нашы пераменлівыя пачуцці. Яна бачыць і ведае нашы слабасці і нашу сілу, нашы грахі і імкненне да святасці. *Любоў доўгацярплівая, міласэрная, любоў не зайздросціць, любоў не ўзвышае сябе, не ганарыцца,*— кажа апостал Павел. І далей ён працягвае сваё ўзвышанае сведчанне: *яна не радуецца няпраўдзе, а радуецца ісціне; усё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё пераносіць. Любоў ніколі не перастае* (1 Кар. 13: 4–8).

Гімн любові, заспяваны некалі апосталам Паўлам, дагэтуль гучыць у Царкве. У ёй, як і ў яе Заснавальніку, Ісусе Хрысце, злучаны два пачаткі: Божы і чалавечы. Мы прыносім у Царкву чалавечыя чаканні, боль і надзеі. І ў той меры, у якой гэтае прынашэнне здзяйсняецца з верай, ад усёй душы, Гасподзь напаўняе нас Сваёй любоўю, Самім Сабой.

Узлюбленыя браты і сёстры! Сёння мы святкуем Раства Хрыстова, святое Богаўцялесненне. Яно здзейснілася дзеля нас з вамі. Каб мы змянілі смутак на радасць.

Зазірнем унутр уласнай душы. Ацэнім свае думкі, пачуцці, усе свае схільнасці перад абліччам Вечнага Жыцця, яўленага сёння ў Богадзіцяці. Калі мы ўгледзімся ў евангельскія падзеі, то ўбачым, што ў Віфлеем з розных бакоў імкнуцца людзі. З аднаго боку, гэта вешчуны і пастухі, паслухмяныя волі Божай. З другога боку, гэта пасланнікі Ірада, які вырашыў знішчыць Віфлеемскіх немаўлят. Прастата і мудрасць адных. Страх і прагнасць другіх.

Намеры нашага розуму, падобна да людзей, апісаных у Евангеллі, раздзяляюцца перад абліччам Божым. Здолеем жа ў гэтыя святочныя дні ўстаць на бок мудрасці і прастаты. Прымірымся з бліжнімі, адкінем грахоўныя звычкі, адступім хоць бы на час ад жыццёвай мітусні, каб азарыцца святлом Віфлеемскай зоркі і сагрэцца дыханнем уцялесненага Бога.

У надыходзячым годзе мы будзем святкаваць 700-годдзе з дня нараджэння вялікага ўгодніка Божага — прападобнага Сергія Раданежскага. Заснаваўшы манастыр у імя Прасвятой Троіцы, ён усю зямлю Святой Русі прысвяціў Ёй. Спрадвечная любоў Айца, Сына і Святога Духа стала дзейснай сілай, якая праз духоўныя намаганні прападобнага Сергія ацаляла душы суайчыннікаў.

У 2014 годзе Беларуская Праваслаўная Царква будзе ўрачыста адзначаць 30-годдзе ўстанаўлення Сабора Беларускіх святых. Нашы святыя на працягу ўжо многіх стагоддзяў яўляюць нам узор духоўнага ўзыходжання, да якога пакліканы і кожны з нас: *абнавіцца духам і апранецца ў новага чалавека, створанага па Богу, у праведнасці і святасці ісціны* (Эф. 4: 23–24).

Сёння мы маем патрэбу ў героях веры і любові, героях штодзённага хрысціянскага жыцця. Мы маем патрэбу ў тым, каб яслі нашых сэрцаў асвяціліся святлом Каляднай зоркі, што абвяшчае сілу любові. Будзем памятаць словы апостала Іаана Багаслова: *хто знаходзіцца ў любові, той знаходзіцца ў Богу, і Бог у ім* (1 Ін. 4: 16).

Калядны перыяд — гэта заўсёды добрая нагода для выказвання шчырых сямейных пачуццяў. Дай Божа, дарагія браты і сёстры, каб мы сталі ў гэтыя дні дабрэйшымі адзін да аднаго.

Вітаю ў гэтыя дні братоў і сясцёр, якія знаходзяцца цяпер за межамі Айчыны. Дай Божа кожнаму з вас адчуваць цяпло сямейнага ачага. Усім, хто ў гэтыя дні знаходзіцца ўдалечыні ад сваіх блізкіх і родных, нагадваю словы Гасподнія: *Дух дыхае, дзе хоча* (Ін. 3: 8). Мы можам заклікаць Яго ў любым месцы і ў любы час. Бог стаў чалавекам, каб чалавек стаў богам. Менавіта Дух усынаўляе нас Нябеснаму Айцу. А гэта значыць, што кожны чалавек можа ўвайсці ў адзінства Святой Троіцы, па вобразу Якой мы створаны.

Са святам, дарагія браты і сёстры, з Раством Хрыстовым!

# АДКРЫЎСЯ ДЗЯСЯТЫ КАЛЯДНЫ ТУРНІР АМАТАРАЎ ХАКЕЯ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у адкрыцці дзясятага юбілейнага Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У турніры прымуць удзел дванаццаць каманд з Аўстрыі, Германіі, Канады, Расіі, Славакіі, Украіны, Фінляндыі, Францыі, Чэхіі, Швейцарыі, Швецыі і Беларусі.

Турнір складаецца з папярэдняга і фінальнага этапаў. На папярэднім гульні праводзяцца ў адзін круг у трох групах па 4 каманды ў кожнай.

У квартэт А ўвайшлі каманда Прэзідэнта Беларусі і лядовыя дружыны з Германіі, Славакіі і Францыі. Матчы гэтай чацвёркі пройдуць у Палацы спорту.

У групу В уключаны каманды Расіі, Аўстрыі, Чэхіі і Швейцарыі. Яны правядуць свае матчы на лёдзе «Чыжоўка-Арэны».

Трэцюю групу С склалі каманды Канады, Фінляндыі, Швецыі і Украіны. Гэта чацвёрка правядзе свае матчы ў Лядовым палацы на вуліцы Прытыцкага.

У фінальны этап выйдуць пераможцы трох квартэтаў, а таксама лепшая каманда з заняўшых другія месцы.

Фінальны матч і гульня за 3-е месца пройдуць на лёдзе шматпрофільнага культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» 7 студзеня.

Папярэднія гады пераможцам Каляднага турніру сем разоў станавілася каманда Прэзідэнта Беларусі (у 2005, 2006, 2008, 2009, 2010, 2012 і 2013 гадах). Двойчы поспех святкавала расійская дружына.

## У АСНОВЕ ВЫСОКІХ ВЫНІКАЎ — ДОБРАСУМЛЕННАЯ ПРАЦА

**Работнікам сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь**

*Паважаныя таварышы!*

*Віншую вас з прафесійным святам — Днём работнікаў сацыяльнай абароны.*

*З моманту стварэння сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва ў Рэспубліцы Беларусь мінула ўжо 95 гадоў. У сучасных умовах на яе ўскладзена шырокае кола адказных задач па рэгуляванні адносін у сацыяльна-працоўнай сферы.*

*Сёння ў краіне кожны працаздольны чалавек мае магчымасць працаваць і ўмацоўваць свой сямейны дабрабыт, а для непрацаздольных і маламаёмных грамадзян забяспечана надзейная падтрымка з боку дзяржавы.*

*Удасканальваецца заканадаўства па сацыяльным абслугоўванні насельніцтва. На якасна новым узроўні аказваецца адрасная дапамога. Стабільна працуе пенсійная сістэма.*

*У аснове гэтых высокіх вынікаў ляжыць добрасумленная праца ўсіх работнікаў і ветэранаў арганізацый сацыяльнай абароны рэспублікі. Упэўнены, што вы і надалей будзеце ўносіць важкі ўклад у развіццё нашай краіны.*

*Шчыра зычу вам моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі, шчасця, аптымізму і дабрабыту.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# ЗАРПЛАТА-2014: ЧАКАЕЦЦА РОСТ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

— Гэта нізкі каэфіцыент, — заявіў Пётр Грушнік. — Наша задача — да канца 2014 года наблізіць зарплату работнікаў бюджэтнай сферы да заработнай платы ў цэлым па рэспубліцы.

Па словах першага намесніка міністра, сёлета нас чакае сур'ёзная мадэрнізацыя сістэмы аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы. Будзе ўдасканальвацца адзіная тарыфная сетка, працягвацца праца па адмене карэктуючых каэфіцыентаў і паслядоўным набліжэнні памеру тарыфнай стаўкі першага разраду да ўзроўню бюджэту пражытковага мінімуму.

**З 1 студзеня 2014 года ўстаноўлена мінімальная заработная плата ў памеры 1 660 000 рублёў (100% мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек).**

— Мы паспрабуем даць больш свабоды кіраўнікам рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання і бюджэтных арганізацый, каб яны маглі вызначаць умовы і парадак аплаты працы, якія ўлічваюць асаблівасці і спецыфіку адпаведных галін, — заявіў Пётр Грушнік. — Гэта значыць, мы будзем пераходзіць ад цэнтралізаванай сістэмы аплаты працы ў бюджэтным сектары эканомікі да дэцэнтралізаванай. Калі больш проста: зарплата бюджэтніка будзе складацца з дзвюх частак: адну частку будзе даваць дзяржава праз тарыфную стаўку першага разраду, другая частка будзе залежаць ад канкрэтных вынікаў працы кожнага асобнага чалавека і рэгулявацца нарматыўнымі актамі, якія будуць прымаць рэспубліканскія органы дзяржкіравання.

Дарэчы, у 2014 годзе заробак бюджэтнікаў будзе павышацца з улікам рэспубліканскай тарыфнай стаўкі першага разраду, і, акрамя таго, рэспубліканскія органы дзяржкіравання і органы мясцовай улады будуць мець магчымасць павелічэння тарыфнай стаўкі першага разраду ў залежнасці ад вынікаў аптымізацыі колькасці работнікаў. Гэта значыць, сродкі, што пры гэтым будуць сэканомлены, можна будзе накіраваць на павелічэнне зарплаты.

**Тарыфная стаўка першага разраду складае 260 тысяч рублёў (з 1 верасня 2013 года).**

## Дзяржаўным служачым змен чакаць не трэба

У студзені — лістападзе 2013 года сярэднямесячная заработная плата ў дзяржаўным кіраўніцтве ў параўнанні з адпаведным перыядам 2012 года павялічылася на 49,1% і склала 5 696 900 рублёў (у тым ліку ў лістападзе — 6 194 000 рублёў). Суадносіны сярэднямесячнай заработнай платы ў дзяржаўным кіраўніцтве з яе ўзроўнем па эканоміцы ў цэлым у студзені — лістападзе 2013 года склалі 112,2%.

У бліжэйшай будучыні, па словах Пятра Грушніка, ніякіх змен у гэтай сферы не будзе.

## У рэальным сектары — лібералізацыя аплаты працы работнікаў

У рэальным сектары эканомікі сёння дзяржавай рэгулюецца толькі аплата працы кіраўнікоў камерцыйных арганізацый. Яна, як заявіў першы намеснік міністра, будзе наўпрост залежаць ад эфектыўнасці работы прадпрыемства або арганізацыі. Пры гэтым Пётр Грушнік падкрэсліў, што бонусы і ў цэлым зарплата кіраўніка будуць залежаць ужо нават не столькі ад прыбытку прадпрыемства, колькі ад прыросту чыстага прыбытку.

У цэлым у рэальным сектары эканомікі дамінуючым падыходам з'яўляецца лібералізацыя аплаты працы работнікаў камерцыйных арганізацый і пашырэнне правоў наймальнікаў у стымуляванні іх працы. Усе формы і ўмовы аплаты працы фарміруюцца адпаведнымі актамі на ўзроўні канкрэтнай арганізацыі ў залежнасці ад яе фінансавых вынікаў.

**Святлана БУСЬКО.**

# МІЛАСЭРНАСЦЬ НЕ МОЖА БЫЦЬ «АДНАРАЗОВАЙ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У канцы года ў нас звычайна было шмат дабрачынных паступленняў. Мы ж існуем за кошт ахвяраванняў. Але лёгка ахвяраваць адзін раз. А мы займаемся руціннай працай, якую трэба рабіць пастаянна. І для яе вельмі цяжка знайсці крыніцы фінансавання. Таму я сустракаю новы год з пэўным неспакоем.

**Алена ГЕРМАН,**
**дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва г. Баранавічы**



— Мы ў цэнтры зараз актыўна развіваем працоўныя майстэрні. Нядаўна правялі сумесны сход са сваімі падапечнымі і іх бацькамі, збіраемся адкрыць сацыяльны магазін, у якім жыхары горада змогуць купіць сувеніры і вырабы ручной працы, аўтарамі якіх з'яўляюцца нашы маладыя людзі. Нашы падапечныя асвоілі шэраг спецыяльнасцяў. Некаторыя з выхаванцаў ужо афарміліся як рамеснікі, астатнія таксама будуць афармляцца. У планах — магчымае адкрыццё невялікага прадпрыемства.

Таксама ішла падрыхтоўчая праца па стварэнні ўніверсітэта для пенсіянераў сумесна з Баранавіцкім дзяржаўным універсітэтам. Гэта наша мара. Хочам, каб баранавіцкія пенсіянеры жылі актыўным, насычаным жыццём. У любым узросце ёсць свае плюсы. У сярэднім узросце — гэта наяўнасць вольнага часу. Напрыклад, жанчына ўсё жыццё марыла навучыцца вязаць ці маляваць, але за штодзённымі клопатамі так і не здолела. Калі наш універсітэт усё-такі будзе створаны (а мы вельмі на гэта спадзяёмся), то ў пенсіянераў з'явіцца шанц рэалізаваць свае даўнія мары.

**Рыгор ПАПОВІЧ,**
**дырэктар Бабіцкай дапаможнай школы-інтэрната Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці**



— Мы ўвесь год працавалі над праектам «Сацыяльная перадышка». Гэта вельмі перспектыўны праект, запатрабаваны. Калі коратка, то яго сутнасць заключаецца ў тым, каб даць невялікі адпачынак, своеасаблівыя канікулы сем'ям, якія выхоўваюць дзетак з інваліднасцю. Для гэтага можна прывезці сваё дзіця на нейкі час да нас (ад некалькіх дзён да трох тыдняў у месяц), і мы абяцаем даглядаць яго, вучыць па адпаведнай праграме, арганізоўваць вольны час і выконваць праграму рэабілітацыі, калі гэта патрэбна. А бацькі за гэты час могуць правесці ў кватэры рамонт альбо, напрыклад, заняцца сваім здароўем. Гэтая праграма даволі складана пачыналася, але бацькі потым ацанілі яе.

Хацелася б, безумоўна, каб заробкі былі вышэй — вельмі цяжкая праца ў нашых педагогаў і з вельмі няпростымі дзецьмі. Яна патрабуе вялікага псіхічнага, фізічнага і эмацыянальнага напружання. Каб больш увагі надавалася і маладым спецыялістам. Таму што многія, адпрацаваўшы два гады, шукаюць новае месца. Наш калектыў стабільны, але ў першую чаргу за кошт людзей, якія да нас прыйшлі звыш 10 гадоў таму.

**Сяргей ДРАЗДОЎСКІ,**
**каардынатар «Офіса па правах людзей з інваліднасцю»**



— Я назваў бы 2013-ы годам страчаных магчымасцяў — у тым сэнсе, што мы так і не падпісалі Канвенцыю аб правах інвалідаў. Зразумела, што яна не «чароўная палачка», але, тым не менш, можа быць эфектыўным інструментам вырашэння праблем людзей з інваліднасцю. Усюды дэкларуецца, што яе падпісанне — адказны крок. Але тады да яго трэба сапраўды сур'ёзна рыхтавацца, агучваць праблемы…

На жаль, не скарацілася колькасць зваротаў у наш офіс з нагоды парушаных правоў людзей з інваліднасцю і не змяніўся іх характар.

У пачатку мінулага года Міністэрства аховы здароўя зацвердзіла пералік захворванняў, з якімі нельга трапіць у аддзяленне дзённага знаходжання. У жніўні ён пачаў дзейнічаць і фактычна адрэзаў ад аддзяленняў дзённага знаходжання пэўную колькасць людзей са скажам, значнай разумовай недастатковасцю. Ім усім прапанавана пайсці ў інтэрнат. Але эфект ад аддзяленняў дзённага знаходжання быў відавочны. А цяпер увесь цяжар дапамогі такім людзям зноў абрынуўся на сям'ю.

**Іна АФАНАСЬЕВА,**
**спявачка**



— У гэтым годзе я была старшынёй журы конкурсу для дзетак з парушэннямі зроку, які прыгожа называўся «Пташка ранняя». І павінна сказаць: колькі ж у нас разумных, таленавітых дзетак, колькі прыгожых галасоў! Я займаюся дабрачыннасцю з 1990-х гадоў. Яшчэ ў 1995 годзе пазнаёмілася з сям'ёй, што выхоўвала дзяўчынку-інваліда. І мне захацелася зрабіць нешта карыснае для гэтых людзей. Калі ў тыя гады я давала дабрачынныя канцэрты, на мяне глядзелі як на вар'ятку. Але ў апошнія 5–6 гадоў шмат чаго змянілася, дабрачыннасцю сталі займацца многія.

Я лічу, што кожны чалавек, які чагосьці дасягнуў у жыцці, павінен дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Гэта не толькі людзі з інваліднасцю, але і пенсіянеры, і тыя, хто застаўся, напрыклад, без працы. Дарэчы, я бывала ў многіх сем'ях, у якіх ёсць людзі з абмежаванымі магчымасцямі, бачыла, як ім складана жывецца. І ў той жа час я заўважыла: нягледзячы на шматлікія праблемы, людзі ўмеюць радавацца, у іх можна павучыцца таму, як быць моцнымі, нягледзячы ні на што.

**Ірына ЖЫХАР,**
**каардынатар груп узаемадапамогі і псіхалагічнай падтрымкі анкапацыентаў**



Напрыканцы 2011 года мы разам з актывістамі, валанцёрамі і аднадумцамі грамадскага аб'яднання «Беларуская арганізацыя працоўных жанчын» стварылі суполку анкалагічных пацыентаў і ўсіх, хто іх падтрымлівае. Па сутнасці, гэтая суполка была створана людзьмі, якім быў пастаўлены дыягназ «рак», а таксама роднымі і блізкімі анкахворых.

Пачыналі сваю працу з арганізацыі групы падтрымкі анкалагічных хворых у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна сталіцы. І летась наш рух набіраў абароты. Аналагічныя групы з'явіліся ў Маскоўскім і Фрунзенскім раёнах Мінска. Таксама да ўжо дзеючых груп падтрымкі ў Смаргоні, Рэчыцы і Клічаве дадалася яшчэ група ў Бабруйску. Зараз такая група зараджаецца і ў Пінску.

Усё гэта натхніла нас на стварэнне рэспубліканскай некамерцыйнай арганізацыі. Ужо ўзгоднена яе назва — сацыяльна-асветніцкая ўстанова «Цэнтр падтрымкі анкахворых «У імя жыцця». І гэта, напэўна, галоўны вынік года для мяне: мы саспелі, каб унесці свой уклад у супрацьракавую барацьбу ў краіне. Будзем дапамагаць сабе і супрацоўнічаць з дактарамі і ўсімі зацікаўленымі бакамі, пашыраць кола сваіх сяброў, каб працаваць на агульную мэту — паляпшэнне якасці жыцця анкалагічных хворых.

**Запісала Святлана БУСЬКО.**

# У НОВЫ ГОД З НАДЗЕЯЙ!

**З вялікім спадзяваннем на выздараўленне жывуць у гэтыя дні маленькія пацыенты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі.**



Цяжкахворыя хлопчыкі і дзяўчаткі і іх бацькі спадзяюцца, што наступны год будзе шчаслівым, што хваробы нарэшце адступяць і дзяцінства стане радасным і светлым. Падтрымліваць добры настрой у тых, хто ў святочныя дні вымушаны знаходзіцца на бальнічным ложку, прыходзяць у перадсвяточныя дні валанцёры ў выглядзе Дзядоў Марозаў і Снягурак. Учора гэтую медыцынскую ўстанову наведалі адразу пяць Дзядоў Марозаў. Яны раздалі дзеткам каля 200 падарункаў. Гэта была акцыя «Стань падарункам да Новага года», якую тры мінскія ўстановы ажыццявілі разам. Гэта рэабілітацыйныя аздараўленчыя курсы для дзяцей «Мастацтва жыцця», «Пежо-клуб» (клуб аматараў аўто) і кампанія «Алвеста». Святочны канцэрт для дзяцей і бацькоў наладзіў сталічны дзіцяча-юнацкі тэатр «Рэвю». Вядома, што ў хвіліны радасці хваробы адступаюць. Маленькім артыстам важна адчуваць, што і яны таксама здольны ўмацаваць веру ў лепшае.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**




**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Белсвязьстрой» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:**

**здание производственного корпуса**

**общей площадью 4385,0 кв.м (инв. № 500/С-32244)**
на земельном участке с кадастровым номером 500000000004000721 (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования), расположенном по адресу: г. Минск, ул. Стебенева, 10 А, площадь земельного участка – 0,6888 га.
На земельном участке имеются ограничения (обременения) прав в использовании: охранная зона ливневой канализации площадью 0,1880 га, охранная зона водопровода площадью 0,1827 га.
Часть указанного недвижимого имущества сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 27 175 600 800 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (2 717 560 080 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **23.01.2014** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.01.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**



Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк страхового полиса по добровольному страхованию наземных транспортных средств формы 2РП серии ТС № 0033195 **считать недействительным**.

УНП 101883943



**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов**

| | | |
|---|---|---|
| 1. Дата, время, место проведения аукциона: **05 февраля 2014 года, в 15.00, в здании Великодолецкого сельского Дома культуры, ул. Лесная, 2 а.** | | |
| 2. Адрес участка | **Участок № 1: дер. Замошье, 14Б, Великодолецкого сельсовета, Ушачского района** | **Участок № 2: д. Замошье, д. 14В, Великодолецкого сельсовета, Ушачского района** |
| 3. Площадь участка | 0,2431 га | 0,2430 га |
| 4. Кадастровый номер | 224980705601000042 | 224980705601000043 |
| 5. Начальная цена | 15 000 000 руб. | 15 000 000 руб. |
| 6. Шаг аукциона | 2 000 000 руб. | 2 000 000 руб. |
| 7. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: **Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1б, в рабочие дни с 9.00 до 16.00 с 03.01.2014 по 03.02.2014 включительно** | | |
| 8. Размер задатка — 1 500 000 рублей, вносится на расчетный счет: *Великодолецкий сельский исполнительный комитет 3641328011094 в ф-ле № 216 ОАО «СБ Беларусбанк» г. Полоцк, код 150801648, УНП 300007086, ОКПО 28677750* | | |
| 9. Адрес и номер контактного телефона: **Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1б, Великодолецкий сельисполком: 8 02158 23323, 23338, в рабочие дни с 8.00 до 16.00.** | | |



**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска»**

**(во изменение и дополнение ранее опубликованной в газете «Звязда» от 15 октября 2013 года проектной декларации)**

**Застройщик** – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.11.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Загородный, 4-й, д. 64а. Тел./факс: 204-67-99, 252-32-18.

**Режим работы** – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Многоэтажный жилой комплекс со встроенно-пристроенными помещениями административного, торгово-бытового назначения, гараж-стоянками и фирменным магазином-салоном РУП «Издательство «Белбланквыд» по ул. Я. Мавра, 32А расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Объект проектирован с делением на 7 пусковых комплексов, в том числе:

- 4-й пусковой комплекс – офисные помещения № 1, офисные помещения № 2, фитнес-центр (2 ур.), досуговый центр, салон красоты, мастерская бытового обслуживания, аптека, цветочный магазин;

- 5-й пусковой комплекс – магазин продовольственных товаров (2 ур.).

Сведения о цене на объект долевого строительства (на дату опубликования проектной декларации).

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 года № 263 («О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь» для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагается, по состоянию на дату опубликования проектной декларации:

Цена 1 кв.м общей площади по состоянию на дату опубликования проектной декларации сформирована в ценах апреля 2013 года с учетом прогнозных индексов цен в строительстве и составляет: при строительстве офисного помещения № 1 общей площадью 629,8 кв.м – **15 448 000** белорусских рублей; при строительстве офисного помещения № 2 общей площадью 723,4 кв.м – **15 448 000** белорусских рублей; при строительстве фитнес-центра (2ур.) общей площадью 2234,9 кв.м – **17 131 000** белорусских рублей; при строительстве салона красоты общей площадью 399,7 кв.м – **17 131 000** белорусских рублей; при строительстве цветочного магазина общей площадью 61 кв.м – **22 601 000** белорусских рублей. Цена объекта будет корректироваться на протяжении строительства объекта с учетом изменения статистических индексов изменения стоимости строительно-монтажных работ.

**Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства 4-го пускового комплекса – май 2015 года.**

**Предполагаемый срок ввода объекта долевого строительства 5-го пускового комплекса – июнь 2015 года.**

С планировкой объекта долевого строительства и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 64а, к. 102, тел. 252-32-18.

Для заключения договора необходимо:

- быть готовым оплатить в течение 5 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.



**Вниманию акционеров ОАО «Белсолод»**

**14 января 2014 г. по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.**
**Начало работы собрания в 11.30.**
**Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 10.30 до 11.25.**

Участникам собрания иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — также доверенность или договор).
С информацией (документами) при подготовке к проведению собрания можно ознакомиться с 06 января в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. О передаче в собственность гражданам жилых домов.

УНП 200075434 *Наблюдательный совет.*

■ Казка побач

# ЧАРАЎНІЦТВА НА ЛЫСАЙ ГАРЫ

## У Шклоўскім раёне стварылі рэзідэнцыю Дзеда Мароза, дзе пасяліліся героі казак

**Упершыню ў жыцці давялося палятаць на казачнай ступе. Тое, што сродак перамяшчэння папулярнай бабусі нагадвае звычайныя арэлі, якія мацуюцца да хвой з дапамогай ланцугоў, зусім не перашкаджае адчуць сябе вядзьмаркай (у лепшым сэнсе гэтага слова).**

Лысая гара, якая ўзвышаецца над Дняпром (з яе добра відаць усе аколіцы Шклова), з'яўляецца самым загадкавым месцам вядомага помніка прыроды рэспубліканскай славутасці «Ніжнінскі роў». Праз яе праходзіць разлом ледавіковага перыяду, падобных да якога на свеце ёсць яшчэ толькі два — у Еўропе і Паўночнай Амерыцы. Па легендзе менавіта сюды ведзьмы збіраліся на шабашы і танцавалі так, што нават да гэтага часу тут зусім не расце трава. Невядома, ці бачылі іх старажытныя купцы, якія плылі міма гары па Славутым водным шляху «З варагаў у грэкі», але ў сучасных турыстаў ёсць усе шанцы гэта праверыць. Некалькі гадоў таму тут пабудавалі экскурсійны комплекс у стылі старадаўняга драўлянага дойлідства. А ў канцы сёлетняга снежня тут запрацавала рэзідэнцыя Дзеда Мароза, па дарозе да якога якіх толькі цудаў ні сустрэнеш.

— Ідэя стварыць рэзідэнцыю галоўнага сімвала Новага года належыць нашаму старшыні райвыканкама Аляксандру Бойку, — кажа дырэктар Цэнтралізаванай клубнай сістэмы Шклоўскага раёна Алена Князькова. — Не ўсе ж маюць магчымасць з'ездзіць у Белавежскую пушчу. Вось і вырашылі зрабіць нешта незвычайнае на тутэйшых землях — арганізавалі забаўляльны маршрут па матывах вядомых казак.

**Асабліва бянтэжацца маленькія дзеткі, якія наогул упершыню чуюць, як гучыць месяц іх нараджэння на беларускай мове. Хаця б дзеля гэтых новых ведаў варта было б пабываць на Лысай гары.**

Чароўны дух адчуваецца ўжо каля варот, дзе для большага парадку стаяць грозныя вартаўнікі. Збоку металічны гонг, падобны на вялікі казан для плову, і драўляны малаток. Трэба тройчы грукнуць па «казане», дзьмухнуць, плюнуць — і вароты адчыняцца. Дзеці ўрываюцца ў гэтую цудоўную рэчаіснасць са шчаслівымі крыкамі: «Я ў казцы!». І нават дарослыя, хоць і не вераць у цуды, у душы таксама пачынаюць іх чакаць. Сустракае гасцей гаспадыня Лысай гары, у якую ператвараецца метадыст шклоўскага Дома культуры Наталля Валуева. Без яе ў чароўным лесе можна і зусім не знайсці Дзеда Мароза. ...Што ні крок, то новая казка. Арганізатары пастараліся, каб маршрут быў не толькі забаўляльным, але і павучальным.

Першае выпрабаванне чакае пры знаёмстве з казкай «12 месяцаў». Хлопчыкі і дзяўчаткі з цікаўнасцю разглядаюць намаляваных у поўны рост братоў, спрабуюць перавесці на рускую мову іх беларускія назвы, але не ва ўсіх гэта добра атрымліваецца. Асабліва бянтэжацца маленькія дзеткі, якія наогул упершыню чуюць, як гучыць месяц іх нараджэння на беларускай мове. Хаця б дзеля гэтых новых ведаў варта было б пабываць на Лысай гары.

Мясцовыя майстры не пашкадавалі ні сіл, ні фарбаў, каб засяліць лес казачнымі істотамі. Вунь паміж галінак мільгае ступа Бабы Ягі, а збоку гусі-лебедзі нясуць на крылах маленькага Іванку. На вочы трапляе русалка, якая сядзіць... на сасне. Крышку яе шкада: сасна гэта табе нават не дуб. А вось кот і насамрэч вучоны — у пінжаку і ў акулярах (напэўна, памяняў на ланцуг, на якім, як сведчыць Пушкін, ён хадзіў у казачным Лукамор'і). Дарослыя смяюцца з гэтых недарэчнасцяў, а дзецям усё цікава. Асабліва калі побач з маляванымі персанажамі з'яўляюцца жывыя (артысты клубнай сістэмы раёна) — Марфушачка-душачка і Насачка з «Марозкі», Ямеля, Маша і мядзведзь. Яны ведаюць такія цікавыя гульні, што з імі нават не хочацца расставацца.

Гуляць па Лысай гары адно задавальненне — лямпачкі мільгацяць, музыка іграе. Ёсць тут і сакральны камень, які падказвае падарожніку, што яго чакае, калі ён зверне ў той ці іншы бок. Кажуць, калі зрушыць яго з месца, усе таямніцы Лысай гары адкрыюцца. Але такога асілка яшчэ не знайшлося. Прыходзіцца абмяжоўвацца звычайным дакрананнем да каменя і загадваннем жадання. Жаданні тут і наогул можна загадваць бясконца. І чамусьці верыцца, што яны абавязкова збудуцца.

Чароўныя істоты не толькі гуляюць па запаведных сцяжынках, але і маюць асабістае жыллё. Тутэйшая Баба Яга, напрыклад, замест хаткі на курыных ножках атрымала добраўпарадкаваныя двухпавярховыя апартаменты. Але перш чым запрасіць да сябе ў госці, яна вучыць гасцей лятаць на ступе. «Ахвотныя азалаціцца павінны на мятле Бабы Ягі пракаціцца», — залатое правіла Лысай гары. Дзеці нават не заўважаюць, што за навучаннем наводзяць «марафет» вакол хаткі хітрай бабулі. Але яна не такая ўжо і благая. Нездарма некаторыя не супраць нават застацца ў яе ў памочніках.

Ёсць што паглядзець і ў іншых хатках, дзе жывуць сімвалічны шклоўскі агурок, захавальніца даўніны Мар'я-мастачка. Дарэчы, Мар'я-мастачка (Вікторыя Зязюліна) — майстрыха не толькі па казцы, але і ў жыцці. Асабліва карыстаюцца поспехам яе самаробныя лялькі. Гаспадыня агурковай хаткі можа навучыць, як сабраць добры ўраджай, у прыватнасці, гуркоў, і нават пачаставаць нарыхтоўкамі. Яны вельмі смачныя, таму іх на ўсіх не хапае. Але ніхто не забараняе глядзець на агароднінныя нарыхтоўкі і аблізвацца — вунь яны, на палічцы. Захавальніца даўніны ўсім прапануе павараЖыць, як гэта рабілі нашы продкі: на жыце ці на фасолі. І так добра гэта ў яе атрымліваецца, што нават дарослыя пытаюцца: а тое, што вы нам прадказалі, праўда?

На жаль, сёлета не пашанцавала са снегам. Напэўна, Дзед Мароз праспаў. Але дзеці ўсё роўна яго любяць. З задавальненнем гуляюць з ім у... шышкі (між іншым, гэта не горш, чым у снежкі) і дораць свае паштоўкі. Свята на Лысай гары не абыходзіцца без вясёлага карагоду і гульняў вакол ёлкі. А які смачны чай з піражкамі, якім напрыканцы частуе сваіх гасцей Дзед Мароз!

Дарэчы, каб казку зрабіць быллю, шклаўчанам спатрэбілася каля 2 месяцаў. Нават суботнікі праводзілі, каб паспець да свят. Аддзелы райвыканкама, школы, індывідуальныя прадпрымальнікі, фермеры, арганізацыі і прадпрыемствы — усе ўнеслі сваю лепту ў справу. Як адзначыў намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Давыдовіч, прозвішчы найбольш актыўных удзельнікаў будуць адзначаны на спецыяльнай дошцы, якую ўсталююць на ўездзе ў казку. І Новым годам справа не скончыцца. Наперадзе яшчэ шмат розных свят.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**



Гаспадыня Лысай гары Наталля Валуева і Мар'я-мастачка Вікторыя Зязюліна.



«Там ступа з Бабаю Ягой ідзе, брыдзе сама сабой».



Ступа напракат.



Каб вызваліць прыгажуню ад чараў, трэба спачатку пацалаваць лягушку.



**ВЯЛІКАГА ШЧАСЦЯ ВАМ І ДАЎГАЛЕЦЦЯ!**

Віншуем **ветэранаў былых калгасаў «Новы шлях», імя Дзімітрава і «Іскра», хлебаробаў СВК «Бездзеж-Агра»**, а таксама **ўдзельнікаў ансамбля народнай песні і музыкі «Сваякі»**, якому споўнілася 15 гадоў, з Новым годам і Калядамі. Вялікага зямнога шчасця вам на доўгія гады!

**Праўленне СВК «Бездзеж-Агра» Драгічынскага раёна.**

*УНП 200226708.*



Паважаную **Валянціну Цімафееўну МАЗЖАРАВУ**, нашу супрацоўніцу, сардэчна віншуем з юбілейным днём нараджэння!

*Шчыра жадаем здароўя і шчасця.*
*Каб не было ні няўдач, ні напасцяў.*
*Зычым яшчэ, каб была Ваша хата*
*На дабрабыт, на сяброўства багата!*

**Звяздоўцы.**

■ Сваімі рукамі

# ЗВАЛЯЙ МНЕ... «ПЕРНІК»

**Вольга Трубач займаецца фелтынгам — валяннем з воўны — усяго толькі год, але засвоіць гэтае майстэрства аказалася нескладана. Цяпер дзяўчына з захапленнем валяе бранзалеты, пацеркі, брошкі і нават карціны.**





### Ад валёнкаў да пано

— Яшчэ нічога не ўмеючы, я паехала і закупілася воўнай. Яна такая мяккая, а як пахне — панюхай!.. — працягвае мне чырвоны скрутак воўны. Што мяккая — сапраўды, яе хочацца гладзіць, як кошку. А пах... Шчыра кажучы, на аматара.

Тым не менш з авечай воўны можна зваляць што заўгодна: і адзенне, і пано, і цацкі, і ўпрыгажэнні. Валяюць нават сумкі і вокладкі для нэтбукаў і электронных кніг, пледы, каптурыкі, рукавічкі і, вядома, валёнкі. Мы ж сустрэліся з Вольгай, каб зрабіць упрыгажэнні на елку, якія майстрыха назвала «пернікамі», бо па форме яны нагадваюць гэты ласунак.

Ёсць шмат відаў воўны, якія адрозніваюцца па ступені апрацоўкі, якасці, месцы вырабу, а таксама прызначэнні. Для асновы «перніка» Вольга адрывае камячок белай воўны памерам з кулак, якую яна называе «грабяная стужка» (дасканала апрацаваная і мяккая, з яе можна выцягваць доўгія пасмы). Заўважаю ў матэрыяле стрэмкі, і суразмоўца тлумачыць, што гэта проста воўна не вельмі добрай якасці, але для асновы яе можна выкарыстоўваць.

**Калі няма лагоднага ўнутранага настрою, то праца не пойдзе. Таму перад тым, як садзіцца за валянне, неабходна вырашыць усе «знешнія» пытанні.**

— Воўна — вельмі «ўдзячны» матэрыял, — заўважае Вольга, — з яе можна рабіць што заўгодна.

### Укол, яшчэ ўкол...

І сапраўды, у руках валяльшчыцы за лічаныя хвіліны з'яўляецца акуратны белы шарык. Цяпер на яго трэба накласці колер, каб ён стаў яркім. Для гэтага Вольга бярэ турэцкую воўну ярка-ружовага колеру і пачынае наслаіваць яе на шар, нібы спавіваючы яго. Калі ўся аснова пакрыта ружовым слоем, можна прыступаць да валяння. Для гэтага патрэбны спецыяльныя іголкі для фелтынгу. Яны маюць зубчыкі, пры дапамозе якіх валокны воўны пераплятаюцца паміж сабой. Іголак спатрэбіцца некалькі, бо яны пры доўгім выкарыстанні награваюцца і... ламаюцца. Таму ім трэба даваць «адпачываць», перыядычна мяняючы.

Таксама патрэбны кавалак паралону: ён падкладаецца пад будучы выраб, каб не пашкодзіць іголкай паверхню, на якой працуе майстар. Вольга бярэ звычайную губку для посуду — для нашай невялікай цацкі яе дастаткова. А затым пачынае проста калоць іголкай ваўняны шар, і праз колькі хвілін ён утрамбоўваецца, сплюшчваецца і пераўтвараецца ў пухнаты «блінчык».

— Як толькі наш «пернік» атрымаў форму, можна пачынаць дадаваць воўну іншага колеру, якая будзе яго аздабляць.

І вось па ружовай аснове рассыпаюцца жоўтыя пасмачкі. Укладваюцца крыж-накрыж, каб атрымаўся ўзор сняжынкі, а пасля на кожны рог — яшчэ некалькі маленькіх пасмачак-прамянёў. Тэхніка зусім не складаная, воўна нібы «прышываецца» ці, лепш сказаць, «прыклейваецца» да асновы. Як валокны воўны счапляюцца паміж сабой пры валянні, для мяне заўжды было загадкай. Ды так шчыльна, што не разарвеш. Вольга заўважае, што воўна — як своеасаблівы пластылін: ёй можна надаць любую форму. Ды і працаваць з ёй лёгка і даволі хутка, таму гэтым відам рукадзелля могуць займацца і не надта ўседлівыя людзі. Галоўнае, кажа дзяўчына, адчуць «імпульс», які падкажа, што сапраўды хочаш гэтым займацца. Але ўсё ж пры рабоце з воўнай ёсць адзін істотны момант.

— Калі няма лагоднага ўнутранага настрою, то праца не пойдзе. Таму перад тым, як садзіцца за валянне, неабходна вырашыць усе «знешнія» пытанні.

### 25 хвілін на цуд

Пакуль што валянне для Вольгі — хобі, хоць робіць яна рэчы не толькі для сябе, але і на заказ. Цяпер гэтым займаецца даволі шмат людзей, і кожны вядзе свой пэўны кірунак, займае асобную нішу. У Вольгі ж, псіхолага па адукацыі, таксама ёсць цікавыя задумы, як звязаць прафесію з захапленнем.

— Хацела б заняцца арт-тэрапіяй пры дапамозе валяння. Бо ў гэтай рабоце шмат тэрапеўтычнага. Апроч таго, што можна стварыць нешта і такім чынам самавыразіцца, пакуль працуеш, можна прывесці ў парадак свае думкі. Ды і сама па сабе праца з воўнай — вельмі прыемны занятак.

Нягледзячы на падатлівасць матэрыялу, майстрыха, пачынаючы працу, амаль ніколі не ведае, што ў яе атрымаецца. Прычым ні па сюжэце (так, аднойчы збіралася рабіць ваўняную карціну з чарніцамі, а выйшлі валошкі — настолькі воўна спрыяе палёту фантазіі), ні па форме. Вольга кажа, што з воўнай нельга працаваць, прытрымліваючыся схемы, трэба быць гнуткім, «падладжвацца» пад матэрыял.

Гатовы «пернік» Вольга замочвае ў гарачай вадзе з-пад крана, папярэдне даўшы ёй сцячы, каб была патрэбная тэмпература. Пасля бярэ вадкі сродак для мыцця посуду (пажадана без спецыфічнага паху, таму што пры змешванні з пахам воўны можа атрымацца не вельмі прыемны для носа мікс) і пачынае бязлітасна намыльваць выраб. Шчыра кажучы, я нават спалохалася, што цацка разваліцца, але Вольга супакойвае: маўляў, гэта, наадварот, яе ўмацуе. Успеніўшы як след, а заадно ўтрамбаваўшы «пернік», яго трэба прапаласнуць і высушыць. На батарэі яму сохнуць каля гадзіны. Пасля гэтага можна яшчэ падбіць воўнай, каб выправіць магчымыя хібы, і вышыць стужкамі ці бісерам узор.

На валянне аднаго «перніка» нам спатрэбілася каля гадзіны. Але Вольга кажа, што звычайна, калі нічога не адрывае ад працы, яны атрымліваюцца значна хутчэй — хвілін за 25. Цацкі выходзяць вельмі мілыя і прыгожыя. А галоўнае, яны захоўваюць цеплыню рук, што іх вырабілі, і ад гэтага свята становіцца асабліва прыемным.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота аўтара**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 6 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.05 Меладрама «Час шчасця».**
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Хрышчэння Гасподняга.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10 Меладрама «50 першых пацалункаў».**
**10.50 Камедыя «Пакроўскія вароты».**
**13.25** Eurovision. Без каментарыяў.
**13.30 Анімацыйны фільм «Лаві хвалю!».**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Гісторыя «Славянскага базару».
**16.55 Фэнтэзі «Хронікі Нарніі: Прынц Каспіян».**
**19.15 Камедыя «12 месяцаў».**
**21.00** Панарама.
**21.40** Трансляцыя святочнага Богаслужэння на Раство Хрыстова з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.
**23.40 Меладрама «Паненка-сялянка».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.50 Меладрама «Сказ пра тое, як цар Пётр арапа жаніў».**
**9.30, 21.20** Тэлебарометр.
**9.35 Фільм-казка «Марозка».**
**10.55** Навіны надвор'я.
**11.25** Рэпарцёр.
**12.15 Меладрама «Крок наперад-2: Вуліцы».**
**14.10** Тэніс. Сідней. Жанчыны.
**16.15** «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне».
**16.50 Камедыя «Мытня дае дабро».**
**18.50 Камедыя «Лепш не бывае».**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Меладрама «Крок наперад 3D».**
**23.25** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Чырвоны Кастрычнік» — «Цмокі-Мінск».

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 12.10, 14.00, 0.40** «Калейдаскоп».
**8.05** «Таямніца душы».
**8.35, 11.35, 18.35** «Размовы пра духоўнае».
**8.40** «Тры каралі. Вадохрышча». Дак. фільм.
**9.00** «АРТіШОК».
**9.25** М/ф.
**10.25** «Найменні і вобразы». Кавальская справа.
**10.40** «Андрэй Грамыка. Гігант, якому ўдалося выжыць». Дак. фільм.
**11.40** «Сто скур незабітых мядзведзяў». Дак. фільм.
**12.15 «Цень самурая». Маст. фільм. 1-я — 4-я серыі.**
**15.55** «Без права на дубль». Мікалай Яроменка-малодшы.
**16.45 Дзіцячы фільм. «Марынка, Янка і таямніцы каралеўскага замка».**
**18.05, 21.50** «Культпрасвет».
**18.40 Сусветнае кіно. «Авіцэна».**
**20.30** Калыханка.
**20.50** «Падарожжа ў мінулае». Па старонках «Блакітных агеньчыкаў».
**22.15** «Дзівакі». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.

### БЕЛАРУСЬ 5

**4.40—11.55, 16.10** Тэніс. Турнір ВТА. Сідней.
**11.55** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Чырвоны Кастрычнік» — «Цмокі-Мінск».
**13.45** Біятлон. Кубак свету. Аберхоф. Гонка з масавым стартам. Мужчыны.
**14.35** Баскетбол. Ліга ВТБ. ВЭФ — ЦСКА.
**18.20** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Чырвоны Кастрычнік» — «Цмокі-Мінск».
**19.55** Авертайм.
**20.25** Хакей. КХЛ. «Медвешчак» (Заграб) — «Дынама» (Мінск).
**22.45** Хакей. Калядны турнір. Паўфінал.

### АНТ

**7.00** «Наша раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** Контуры.
**10.05 Маст. фільм «Вакзал для дваіх».**
**12.30, 16.15 Серыял «Ганна Герман».**
**17.40** «Афон. Дастукацца да нябёсаў».
**18.40** «Белая птушка». Канцэрт Алены Ваенгі.
**20.50 Серыял «Тры мушкецёры».**
**22.45 Маст. фільм «Божае нараджэнне».**
**0.35** «Дары вешчуноў. Шлях у Расію».
**1.20** «Цудатворцы XX стагоддзя».

### СТБ

**6.00 Камедыя «Набожная Марта».**
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.25** «Зорны рынг». Удзельнікі праекта «Гарады, якія спяваюць» 1-га сезона супраць удзельнікаў 2-га сезона.
**11.40 Камедыя «Дэніс-мучыцель».**
**13.30 Маст. фільм «Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана».**
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «КВЗ: лепшае на СТБ».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Камедыя «Майкл».**
**22.10** «Песні на ўсе часы». Лепшае.

### МІР

**5.00** М/ф.
**6.30 Маст. фільм «Пра Чырвоную шапачку, працяг старой казкі».**
**9.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**9.10, 2.50 Маст. фільм «Жандар на адпачынку».**
**10.50 Маст. фільм «Трыццаць першага чэрвеня».**
**13.10** М/ф «Востраў скарбаў».
**15.10, 0.50 Серыял «Гаражы».**
**18.10** Цырк дзю Салей: Картэа.
**19.45 Маст. фільм «Француз».**
**21.35** «Зямля і неба».
**22.00** Раство Хрыстова.
**0.00** Дак. фільм «З нагоды. З Богам!».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Камедыя «Набожная Марта».**
**9.30** «Маша і мядзведзь». М/ф.
**10.00, 11.10 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі-3».**
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**13.35** «Мая планета».
**14.10** «Дары вешчуноў».
**15.15** «Калядная «Песенька года».
**16.20** «Новая хваля-2013. Лепшае».
**18.45, 20.25 Маст. фільм «Бераг надзеі».**
**22.55** Весткі. Спецыяльны выпуск.
**23.00** Нараджэнне Хрыстова. Трансляцыя ўрачыстага Каляднага богаслужэння.
**1.00 Маст. фільм «Пернікі з бульбы».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Рускі дубль».**
**13.25 Серыял «Настаўнік у законе. Вяртанне».**
**16.50 Камедыя «Заходзь — не бойся, выходзь — не плач...».**
**18.30** «І зноў прывітанне!».
**19.25 Серыял «Аперацыя «Лялькавод».**
**22.55** «Уздоўж па памяці». Юбілейны канцэрт Аляксандра Новікава.
**0.40** «Ты не паверыш!».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.00, 18.55, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 14.10 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**8.45 Меладрама «Мачаха».**
**10.15, 19.00 Серыял «Рані».**
**12.05 Камедыя «Па-банку».**
**15.45** Мультпарад. М/ф «Каляды».
**16.00** «Мой любімы гадаванец».
**16.30 Серыял «Гімнасткі».**
**17.20 Серыял «Касл».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Востраў».**
**23.30** «Кінаблакнот».

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.30, 14.00** Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
**10.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**11.00, 21.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.00 Меладрама «Адзіночкі».**
**14.30** М/ф «Астэрыкс і вікінгі».
**15.45, 0.15** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**16.30** Кінапародыя «Вельмі рускі дэтэктыў».
**19.00** «Новогодний задорный юбилей». Канцэрт М. Задорнава.
**22.00** Канцэрт А. Макарэвіча «Усё вельмі проста».

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00** Навіны культуры.
**9.15** «Наглядальнік. Успамінаючы Антонія Суражскага».
**10.10** «Мітрапаліт Антоній Суражскі. Цытаты з жыцця».
**10.55** Дзіцячы сеанс. «У некаторым царстве...» «Жыў-быў сабака». М/ф.
**11.40** «Афрыка». Дак. серыял.
**12.30** Славутыя інкогніта. «Artland Тэадора Тэжыка».
**12.55** Спектакль Малога тэатра «Рэвізор».
**16.10** «Тайна белага ўцекача». Дак. фільм.
**17.00** «Правілы жыцця». Ток-шоу.
**17.25** «Больш, чым каханне». Любоў Арлова і Рыгор Аляксандраў.
**18.05 «Светлы шлях». Маст. фільм.**
**19.40** Вялікі балет. Лепшае.
**21.25 «Ісус Хрыстос. Найвялікшая з калі-небудзь расказаных гісторый». Маст. фільм.**
**0.30** «Руская рапсодыя».
**0.40** «Апостал вяцічаў». Дак. фільм.
**1.20** П. Чайкоўскі. Серэнада для струннага аркестра.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.10** «Вам песня прысвячаецца, або Зноў карнавальная ноч». Кінаканцэрт.
**6.10** «50/50» «З Новым годам, таварышы!». 1994 год.
**7.40** «Тэатральныя сустрэчы». 1975—1976 гг.
**9.00 «Меладрама з замахам на забойства». Маст. фільм.**
**10.10** «Цуды на Вераб'ёвай гары». 1992 год.
**11.00, 13.00** «Шынок 13 крэслаў». 1969 год.
**12.00, 21.00** «Народжаныя ў СССР».
**14.00** «А трынаццатай гадзіне ночы». Музычны фільм. 1969 год.
**15.20** «Чатыры інтэрв'ю з зімой». Фільм-канцэрт.
**16.30 «Запасное кола». Маст. фільм. 1978 год.**
**17.00** «З самага ранку». 1992 год.
**17.35** «Усё пачынаецца з дзяцінства». Дак. фільм.
**18.30** «Калядныя сустрэчы. Тэатр песні Алы Пугачовай». 1989 год. 1-я частка.
**19.40** «Спакойнай ночы, малыя».
**20.00, 2.00** «Мінулы час»
**22.00** «У навагоднюю ноч». 1992 год. 1-я частка.
**23.10** «Для вас, бацькі!». 1981 год.
**23.40** «Ранішняя пошта». 1986 год.
**0.10** «Піф-паф ой-ой-ой». М/ф.
**0.30 «Навагоднія прыгоды Машы і Віці». Маст. фільм.**
**1.40** «Спакойнай ночы, малыя». У гасцях у Юрыя Нікуліна.
**3.00** «Колба часу».
**4.00** «Кінапанарама». 1984 год.

### EUROSPORT

**10.30, 20.40, 21.45, 1.00, 3.00** Ралі. Дакар.
**10.55** Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па тэнісе.
**11.00, 14.00** Лыжныя гонкі. Тур дэ Скі.
**11.30, 15.30** Біятлон. Кубак свету.
**13.00, 17.45, 0.00** Скачкі на лыжах. Турнэ 4-х трамплінаў.
**16.30, 19.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**20.45, 2.45** Вось гэта дзіва!!!
**21.00, 21.50, 1.30** Дартс. Чэмпіянат свету.
**23.55** Тэніс. Вяртанне Рафы.
**0.55** Тэст-райд.
**2.30** Ралі-рэйд. Афрыка Эка Рэйс.

### КАМЕДЫЯ

**5.00** Камедыя «Шэф».
**6.25** Камедыя «Мая мачаха — іншапланецянка».
**8.10** Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Суседзям увахад забаронены».
**9.45, 16.40, 23.45** Скетчком «Паміж намі».
**10.10** Камедыя «Алмазны сабака».
**11.55** Камедыя «Спатканне».
**13.25** Камедыя «Выкрутасы».
**15.05** Камедыя «Мой хлопец — Анёл».
**17.00** Камедыя «Беласнежка: помста гномаў».
**18.50** Камедыя «Дзіўныя сваякі».
**20.20** Меладрама «Больш, чым сябар».
**22.10** Камедыя «Сілач Санта-Клаус».
**0.05** Камедыя «Эйс Вентура 2: Калі кліча прырода».
**1.40** Камедыя «Вясельны пярэпалах».
**3.20** Камедыя «Ёлкі 2».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Паненка і кухар».
**10.30** «Адзін дома 3». Маст. фільм.
**12.30** «Адзін дома 4». Маст. фільм.
**14.15** «Рэальныя Каляды». Маст. фільм.
**16.00, 3.00** «Каханне і глянец». Дак. фільм.
**16.45** М/ф «Балто 3».
**18.05, 3.40** «Віват, гардэмарыны!». Маст. фільм.
**20.45** «Пра што яшчэ гавораць мужчыны». Маст. фільм.
**22.40** «Прывід оперы». Мюзікл.
**1.10** «Тайна Сызранскай іконы». Дак. фільм.
**2.05** «Часова даступны».

### ТБ1000

**5.00, 14.40** Баявік «Чалавек-павук 3».
**7.25** Трылер «Добры немец».
**9.20** Камедыя «З вачэй — далоў, з чарта — вон!».
**11.10** Камедыя «Шалёныя грошы».
**13.00** Драма «Тайны знак».
**17.05** Драма «Баец».
**19.05** Драма «Скарб».
**21.00** Маст. фільм «Дзённік памяці».
**23.15** Трылер «Паляўнічы на забойцаў».
**1.00** Драма «Парфумер: Гісторыя аднаго забойцы».
**3.25** Камедыя «Джэк і Джыл: Каханне на чамаданах».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Камедыя «Чорны баран».
**8.00** Фэнтэзі «Рыжык у Залюстаркоўі».
**10.10** Драма «Злачынства і пакаранне».
**12.20, 4.00** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Сабака Баскервіляў».
**13.45** Драма «Збавенне».
**16.00** Камедыя «Праўдадыр разнаскурых».
**18.00** Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
**20.00** Драма «Духless».
**22.00** Камедыя «Усё проста».
**0.00** Камедыя «Самазабойцы».
**2.00** Драма «Доўгае шчаслівае жыццё».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 22.00** Расследаванні авіякатастроф.
**6.00, 8.00, 12.00, 15.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**7.00** Галівудскі мядзведзь-забойца.
**9.00, 13.00** Злавіць сома.
**10.00, 17.00, 19.00** Мегазаводы.
**11.00** Шукальнікі скарбаў.
**14.00** Мядзведзі вострава Страха.
**16.00, 2.00** Вялікія ўцёкі.
**18.00** Золата горада-прывіда.
**20.00, 0.00, 3.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 1.00, 4.00** Суперзбудаванні.
**23.00** У пагоні за НЛА.

### DISCOVERY

**7.00** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**7.50, 13.15** Майстры выжывання.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Шукальнікі скарбаў Амерыкі.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Навука магіі.
**12.20, 1.50** Сапраўдныя аферысты.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05, 6.05** Махінатары.
**16.25** Адзін дзень з жыцця Беара Грылса.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Як уладкавана Зямля.
**19.10** Пяцёрка лепшых.
**21.00** Эд Стафард: голае выжыванне.
**22.00** Беар Грылс: кадры выратавання.
**23.00** Хлопцы з Юкана.
**0.00, 5.10** Нябачныя светы.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для индивидуального жилищного строительства в д. Старый Лепель

## Организатор: Стайский сельский исполнительный комитет

| № лота | Вид аукциона, целевое назначение | Месторасположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома | д. Старый Лепель, У-1, Лепельского района, площадь 0,2500 га, кадастровый номер 222783608601000207 | - водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Лепельское)<br>- получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительства | 11 270 383 | 10 000 000 | 1 000 000 |
| 2 | В частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома | д. Старый Лепель, У-2, Лепельского района, площадь 0,1458 га, кадастровый номер 222783608601000208 | - водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (озеро Лепельское);<br>- получение победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительства | 8 815 987 | 5 000 000 | 500 000 |

1. **Аукцион состоится 14 февраля 2014 года в 14.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, аг. Стаи, ул. Лепельская, д. 12.**

2. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Витебская обл., Лепельский р-н, аг. Стаи, ул. Лепельская, д. 12. Последний день приема заявлений — **10 февраля 2014 года до 17.00**

3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10% от начальной цены объекта аукциона в кассу Стайского сельисполкома или на расчетный счет 3641319101034 в ЦБУ № 211 филиала № 214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Лепель, ул. Гагарина, 1, МФО 660, УНП 300039704. Получатель — Стайский сельский исполнительный комитет.

4. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителям гражданина — нотариально удостоверенную доверенность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, и копии платежных документов, подтверждающих уплату залога.

5. Не допускается начало торгов по начальной цене.

6. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, расходов по подготовке и изготовлению документации, расходов на публикацию в средствах массовой информации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении (передаче в частную собственность) победителю аукциона земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

**Контактные телефоны: 8 (02132) — 2 49 42; 2 40 60; 8(029) 309 33 58 (велком); 8(029) 890 07 98 (МТС).**

## ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА от 26 нобря 2014 года

**Заказчик-Застройщик** – ОАО «Минскпромстрой».

**Цель проекта** – Строительство Жилых домов №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями в составе объекта «Группа многоэтажных жилых домов со встроенно-пристроенными объектами общественного назначения и подземной гараж-стоянкой по пр. Дзержинского в микрорайоне «Малиновка-1» в г. Минске» общей площадью 35,7 тыс. кв.м, в том числе общая площадь квартир – 32,8 тыс. кв.м, встроенные помещения – 2,9 тыс. кв.м, гараж – стоянка – 14 тыс. кв.м.

На дату опубликования декларации и по 31 января 2014 г. для юридических лиц и физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, к долевому строительству предлагаются 11 квартир:

- 4 однокомнатных квартиры, общей площадью по СНБ от 43,84 $м^2$ до 43,14 $м^2$, стоимостью за 1(один) кв.м общей площади в размере 16 257 500 рублей эквивалентной 1750 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 21 ноября 2013 года при длительной оплате;
- 2 двухкомнатные квартиры общей площадью по СНБ от 63,53 $м^2$ до 67,3 $м^2$ стоимостью за 1(один) кв.м общей площади в размере 15 793 000 рублей эквивалентной 1700 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 21 ноября 2013 года при длительной оплате;
- 5 трехкомнатных квартир общей площадью по СНБ от 81,95 $м^2$ до 87,35 $м^2$, стоимостью за 1(один) кв.м общей площади в размере 14 864 000 рублей эквивалентной 1600 долларам США по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на 21 ноября 2013 года при длительной оплате.
- 30 машино-мест в надземных закрытых шестиуровневых гараж-стоянках №№ 1, 2 по цене в зависимости от уровня и вида оплаты.

Стоимости квартир, машино-мест фиксируются в долларовом США эквиваленте и остаются неизменными в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора. Стоимости 1 кв.метра площади квартир указаны без учета выполнения внутренних отделочных работ.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: **г. Минск, пер. Войсковой, 12, каб. 312 или по телефонам: 283 15 88; 283 15 78; Velcom (044) 787 12 68.**

Сайт компании: **www.minskpromstroy.by**

*Генеральный директор В.С. Нехай*

УНП 100064639

Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

**15 января 2014 года в 14.00**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**открытого акционерного общества**

## «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

Собрание пройдет по адресу: **г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О реорганизации ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» путем выделения сельскохозяйственного унитарного предприятия «Вядерево».
2. Об утверждении цены выкупа акций общества по требованию его акционеров, срока предъявления требований (заявлений) и срока оплаты выкупленных акций.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет) с 09 по 15 января 2014 г. (время работы с 8.30 до 17.30), тел. 37 45 66.

**Регистрация участников собрания с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.**

Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию на 09 января 2014 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: **акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.**

УНП 300000398

*Наблюдательный совет*

В **суд Слуцкого района Минской области** поступило заявление об объявлении умершей КИСЕЛЬ Натальи Леонидовны, 05.05.1970 года рождения, уроженки г. Слуцка Минской области, последнее известное место жительства: г. Слуцк Минской обл., ул. Республиканская, д. 1, кв. 11.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Кисель Наталье Леонидовне, сообщить их суду в 2-месячный срок (г. Слуцк, ул. Улосовца, 8).

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

| № лота | Адрес участка | Кадастровый номер 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Ясеневая | 1028170 | 0,0814 | строительство и обслуживание ресторанно-банного комплекса с автомобильной стоянкой | 10 | 84 590 222 | 16 900 000 | 9 108 371 | 0,0036 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 0,4кВ |
| 2 | № 65 (по ГП) согласно ПДП «ЮЗМР-3» | 1028171 | 0,1089 | строительство и обслуживание на дополнительном земельном участке торгового центра | 10 | 98 867 995 | 19 750 000 | 8 437 942 | ограничений в использовании земель нет |
| 3 | в районе «ЮЗМР-3» №№ 39, 40, 41 (по ГП) | 1025055 | 1,2077 | строительство и обслуживание многоквартирного жилого дома | 5 | 603 830 600 | 126 150 000 | 1 244 233 | ограничений в использовании земель нет |
| 4 | ул. Октябрьской Революции (по ГП № 61 в микр-не «ЮВМР-1») | 1013899 | 0,4100 | строительство и обслуживание жилого многоквартирного дома с элементами повышенной комфортности со встроенными многофункциональными объектами (социально-культурного назначения и торговли) | 5 | 264 787 610 | 52 950 000 | 133 823 | ограничений в использовании земель нет |
| Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» | | | | | | | | | |

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881.
- в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;
- в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;
- приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения).

**Аукцион состоится 6 февраля 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 03.01.2014 г. до 17.30 31.01.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже земельных участков гражданам Республики Беларусь в частную собственность в г. Кобрине и Кобринском районе Брестской области 6 февраля 2014 года в 11.00

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по изготовлению документации и на возмещение убытков, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Батчинский сельсовет, дер. Полятичи, ул. Каштановая, 8 | Строительство и обслуживание жилого дома | 124380403601000134 | 0,1500 | 5 200 000 | 520 000 | 3 383 200* |
| 2. | Батчинский сельсовет, дер. Полятичи, ул. Цветочная, 5 | Строительство и обслуживание жилого дома | 124380403601000133 | 0,1500 | 5 200 000 | 520 000 | 3 383 200* |
| 3. | Батчинский сельсовет, дер. Полятичи, ул. Каштановая, 6 | Строительство и обслуживание жилого дома | 124380403601000135 | 0,1500 | 5 200 000 | 520 000 | 3 383 200* |
| 4. | Батчинский сельсовет, дер. Большие Лепесы, ул. Урожайная, 44 | Строительство и обслуживание жилого дома | 124380601601000911 | 0,1400 | 14 700 000 | 1 470 000 | 4 162 300* убытки 370 530 |
| 5. | Буховичский сельсовет, дер. Легаты, ул. Новая, 23 | Строительство и обслуживание жилого дома | 124380608101000161 | 0,2303 | 8 550 000 | 855 000 | * |
| 6. | г. Кобрин, по ул. Никольской (участок № 1) | Строительство и обслуживание жилого дома | 124350100001004557 | 0,1308 | 104 500 000 | 10 450 000 | 4 356 680* |
| 7. | г. Кобрин, по ул. Никольской (участок № 2) | Строительство и обслуживание жилого дома | 124350100001004558 | 0,1232 | 98 500 000 | 9 850 000 | 3 610 910* |
| 8. | г. Кобрин, по ул. Никольской (участок № 3) | Строительство и обслуживание жилого дома | 124350100001004559 | 0,1260 | 100 680 000 | 10 700 000 | 3 613 300* |
| 9. | г. Кобрин, по ул. Никольской (участок № 4) | Строительство и обслуживание жилого дома | 124350100001004560 | 0,1232 | 98 500 000 | 9 850 000 | 3 465 055* |
| 10. | г. Кобрин, по ул. Пионерской, 46 А | Строительство и обслуживание жилого дома | 124350100001006903 | 0,1136 | 111 000 000 | 11 100 000 | 7 416 300* убытки 6 870 000 |
| 11. | г. Кобрин, по ул. Пионерской, 46 Б | Строительство и обслуживание жилого дома | 124350100001006904 | 0,1133 | 110 700 000 | 11 100 000 | 7 198 700* убытки 9 680 000 |
| 12. | Хидринский сельсовет, дер. Патрики, ул. Южная, 6 | Строительство и обслуживание жилого дома | 124385506601000276 | 0,2075 | 11 059 000 | 1 110 000 | 65 000* |

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ по продаже земельных участков гражданам Республики Беларусь в частную собственность в г. Кобрине и Кобринском районе Брестской области 6 февраля 2014 года в 11.15

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по изготовлению документации, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Кобрин, ул. Рокоссовского, 4 | Строительство и обслуживание жилого дома | 124350100001006430 | 0,1500 | 101 000 000 | 10 100 000 | 712 293* |
| 2 | г. Кобрин, ул. Гусарская, 12 | Строительство и обслуживание жилого дома | 124350100001006426 | 0,1382 | 93 000 000 | 9 300 000 | 679 800* |

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ М АУКЦИОНЕ по продаже права на заключение договоров аренды земельных участков в г. Кобрине и Кобринском районе Брестской области 6 февраля 2014 года в 11.30

| № лота | Адрес земельного участка | Целевое назначение земельного участка | Срок аренды земельного участка, лет | Кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы по изготовлению документации, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Кобрин, ул. Ленина (в районе дома № 5) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 | 124350100001005809 | 0,0025 | 2 500 000 | 250 000 | 65 000* |
| 2 | г. Кобрин, ул. Ленина (в районе дома № 1) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 | 124350100001005808 | 0,0020 | 2 000 000 | 200 000 | 65 000* |
| 3. | г. Кобрин, ул. Советская на торговой площади ул. Матросова | Установка и обслуживание торгового киоска | 10 | 142000000001000145 | 0,0015 | 2 000 000 | 200 000 | 65 000* |
| 4. | г. Кобрин, ул. Советская на торговой площади ул. Матросова | Установка и обслуживание торгового киоска | 10 | 142000000001000165 | 0,0015 | 2 000 000 | 200 000 | 65 000* |
| 5. | г. Кобрин, ул. Первомайская (в районе дома № 2) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 | 124350100001005606 | 0,0033 | 2 500 000 | 250 000 | 65 000* |
| 6. | г. Кобрин, ул. Ленина (в районе ресторана «Кобрин») в г. Кобрине | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 | 124350100001006203 | 0,0042 | 3 000 000 | 300 000 | 65 000* |
| 7. | Залесский сельсовет, дер. Быстрица, ул. Кобринская (в районе дома № 37) | Установка и обслуживание торгового павильона | 10 | 124382500601000302 | 0,0109 | 1 500 000 | 150 000 | 65 000* |

** и расходы на публикацию извещения в СМИ.*

**Организатор аукционных торгов – Кобринский районный исполнительный комитет.**

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

копию платежного поручения (с отметкой банка отправителя об исполнении) о внесении задатка на расчетный счет 3641000000011 в филиале № 113 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 237, УНП 200042468, получатель – Кобринский райисполком – **по 31 января 2014 г. включительно.**

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

**Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками на местности.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

*Аукционные торги признаются не состоявшимися в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется единственному участнику при его согласии с внесением платы в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).*

**Аукционные торги состоятся 6 февраля 2014 года по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, зал заседаний, 1 этаж.**

**Заявления на участие в аукционных торгах с необходимыми документами принимаются по адресу: г. Кобрин, ул. Суворова, 25, райисполком, каб. 403 с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 31 января 2014 г. включительно.**

**Тел. для справок 8(01642) 2 28 11, 2 32 82.**

**Полная информация об аукционе размещена на сайте www.brest-region.by**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска»**

**(во изменение и дополнение ранее опубликованной в газете «Звязда» от 19 октября 2013 года проектной декларации)**

**Застройщик** – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.11.2004 г. в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Загородный, 4-й, д. 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 252-32-18.

**Режим работы** – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Участок под строительство объекта: «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон № 3 (2-ая очередь строительства). Жилой дом № 23 по генплану» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Десятиэтажный жилой дом на 79 квартир, выполненный на базе изделий модернизированной серии М 464-М с теплым чердаком, техподпольем, остекленными лоджиями со встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, **9 двухкомнатных и 7 трехкомнатных квартир.**

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры в жилом доме № 23 по генплану на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен с учетом прогнозных индексов по состоянию на апрель 2014 года и составляет: при строительстве двухкомнатной квартиры – **11 358 440 белорусских рублей**, при строительстве трехкомнатной квартиры – **10 535 860 белорусских рублей.**

Начало строительства – октябрь 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома – июнь 2014 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 64а, к. 102, тел. 252-32-18.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**КУП «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска»**

**(во изменение и дополнение ранее опубликованной в газете «Звязда» от 14 сентября 2013 г. проектной декларации)**

**Застройщик** – коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Фрунзенского района г. Минска», зарегистрированное Минским городским исполнительным комитетом 18.11.2004 г. в Едином государственном регистре юридических и индивидуальных предпринимателей за № 190580553.

**Место нахождения:** 220073, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Загородный, 4-й, д. 64а.

Тел./факс: 204-67-99, 252-32-18.

**Режим работы** – 8.45 – 17.45, обед 13.00 – 13.45; пятница 8.45 – 16.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

**Информация о проекте.**

Участок под строительство объекта: «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева в г. Минске. Микрорайон № 3 (2-ая очередь строительства). Жилой дом № 18 по генплану» расположен во Фрунзенском районе г. Минска.

Десятиэтажный крупнопанельный жилой дом на 78 квартир состоит из двух секций М464М с теплым чердаком, техподпольем, остекленными лоджиями со встроенным помещением товарищества собственников на первом этаже.

Предлагаются для привлечения к строительству по договорам создания объекта долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, 15 квартир:

14 трехкомнатных квартир и 1 четырехкомнатная квартира.

Цена 1 кв. метра общей площади квартиры в жилом доме № 18 по генплану на дату опубликования проектной декларации сформирована в текущем уровне цен с учетом прогнозных индексов и составляет 11 664 900 рублей.

Начало строительства – август 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию жилого дома – май 2014 года.

С планировками квартир и ходом работ по строительству можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Загородный 4-й, д. 64а, к. 102, тел. 252-32-18.

Для заключения договора необходимо:

- личное присутствие и паспорт (+ ксерокопия) того лица, с кем будет заключаться договор;
- быть готовым оплатить в течение 3 рабочих (банковских) дней с даты регистрации договора в комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома 25 процентов стоимости объекта долевого строительства.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| ЛОТ 1 | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | - Капитальное строение, инв. № 420/С-4164 (назначение – здание административно-хозяйственное, примечание – административное здание), общей площадью – 165,4 кв.м, г. Лида, ул. Калинина, 45.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-45379 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание диспетчерской), г. Лида, ул. Калинина, корп. 1, общей площадью – 92,6 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-44466 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – здание заправочной), г. Лида, ул. Калинина, 45, корп. 7, общей площадью – 20,1 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-44469 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – здание калориферной), г. Лида, ул. Калинина, 45, корп. 5, общей площадью – 12,4 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-4168 (назначение – здание специализированное транспорта, примечание – двухэтажное панельное здание гаража № 2), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 1141,5 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-4163 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 345,3 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-4165 (назначение – здание нежилое, примечание – здание агрегатное, топливное отделение, электроцех, котельная), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 641,7 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-47232 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – насосная), г. Лида, ул. Калинина, 45, корп. 6, общей площадью – 18,6 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-4166 (назначение – здание нежилое, примечание – трансформаторная подстанция), г. Лида, ул. Калинина, 45, общей площадью – 19,6 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-47234 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство), г. Лида, ул. Калинина, сооружение благоустройства производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», общей площадью – 12628,0 кв.м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-46844 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), г. Лида, ул. Калинина, водопроводная сеть на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», протяженностью – 128,3 м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-46843 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), г. Лида, ул. Калинина, канализационная сеть на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», протяженностью – 121,59 м.<br>- Капитальное строение, инв. № 420/С-50292 (назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – крановая эстакада), г. Лида, ул. Калинина, крановая эстакада на производственной территории ОАО «ГродноАТЭП», общей площадью – 0,0 кв.м.<br>- зеленые насаждения, г. Лида, ул. Калинина, 45. |
| Местонахождение объекта | г. Лида, ул. Калинина, 45. |
| Лот расположен на земельном участке | Кадастровый номер 423650100013001252, площадью 1,8513 га (назначение – земельный участок для обслуживания производственной территории) по адресу: г. Лида, ул. Калинина, 45. |
| Примечания | Имеются ограничения со стороны 3-х лиц в виде аренды |
| Начальная цена продажи | 4 458 010 800 (четыре миллиарда четыреста пятьдесят восемь миллионов десять тысяч восемьсот) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 222 900 540 (двести двадцать два миллиона девятьсот тысяч пятьсот сорок) белорусских рублей |
| Продавец | ОАО «ГродноАТЭП», 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 109, тел. 520234 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 5 февраля 2014 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 30 января 2014 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**



■ Нефармат

# АМАЛЬ НАВАГОДНЯЕ...

**Не люблю дні, калі святло трэба паліць амаль да 12 гадзін, інакш цёмна, літары на клавіятуры не разгледзіш. У нас, у Брэсце, гэтай зімой і снегу, лічы, не было, ужо цэлы месяц адны чорна-шэрыя пейзажы за акном. Як сказаў паэт, «у акне слата і ў душы, там і там бязлюдна...» Нават лес стаіць маўклівы і непрыветны. І хоць з экрана тэлевізара, газетных старонак, інтэрнэт-парталаў скачуць-мітусяцца рознакаліберныя Дзяды Маразы, настрой ну зусім не навагодні... Нядаўна пазваніла даўняя сяброўка з райцэнтра, абмяняліся сякімі-такімі навінамі з сямейнага жыцця, па звычцы панаракалі на непрыгожае надвор'е і мінорны настрой, а потым яна нечакана спытала, ці памятаю я наш першы Новы год у інтэрнаце на вуліцы Інтэрнацыянальнай.**

Вядома, памятаю. Мы тады толькі прыехалі ў раённы цэнтр па размеркаванні. Я працавала ў сельгасаддзеле раённай газеты, мае таварышкі па пакоі — у бібліятэцы. Жылі мы ў інтэрнаце будаўнічай арганізацыі. Інтэрнат быў спецыфічны. У ім пражывалі розныя людзі: маладыя спецыялісты з розных устаноў: немаладым ужо спецыялістам быў начальнік крымінальнага вышуку, якога накіравалі з абласнога ўпраўлення працаваць амаль што вахтавым метадам. На другім і трэцім паверхах па два-тры пакоі займалі работнікі арганізацыі-гаспадара з абмежаваннем волі, як кажуць у народзе, «на хіміі». Яны асабліва не дакучалі астатнім жыльцам... калі былі цвярозыя. А на падпітку «хімікі», бывала, вызначаліся. Напрыклад, аднойчы нехта з іх так барабаніў ноччу ў нашы дзверы, што адарваў ручку звонку. Замок быў такой канструкцыі, што ранкам выйсці з пакоя мы не змаглі. Для сучаснага чытача патлумачу: мабільных тэлефонаў тады нават не ведалі. Добра, што наша акно выходзіла на казырок будынка і быў усяго толькі другі паверх. Адным словам, я мусіла вылезці на гэты казырок і прасіць дапамогі ў тых, хто аказаўся ў двары інтэрната. Мяне заўважыў Саша, вадзіцель вялікага «КамАЗа», прыхапіў манціроўку і за тры хвіліны справіўся з нашай бядою. Да гэтай пары памятаю яго словы: «Ужо хацеў націскаць на газ, бачу, ты, як дэсантнік, з акна на страху скачаш». Тады, вядома, было не да смеху. Але і праблемы мы з гэтага не рабілі, бо на працу я амаль не спазнілася.

Дык вось, за першыя паўгода працоўнай біяграфіі і пражывання ў інтэрнаце сябрамі мы не паспелі абзавесціся. Нават святкаваць Новы год, які надыходзіў, асабліва не збіраліся, хіба чыста сімвалічна. Ёлкі ў нас не было. На дварэ стаяла эпоха, калі пустату паліц у крамах маскіравалі якімі-небудзь кансервамі ў адзін рад. А ў рэдакцыі газет прыходзілі ананімныя пісьмы кшталту: «У продаж такіх цукерак не «выкідалі», а ў суседа пад дзвярыма валяецца цэлая куча абгортак ад грыльяжу, прашу разабрацца, адкуль». Дык вось, раніцай выхаднога, па календары — перадnavагодняга дня, пакуль мы яшчэ валяліся ў ложках, у пакой пастукалі. Я адчыніла дзверы, а на парозе з вялікай пушыстай елкай стаяў аграном аднаго з калгасаў, дзе мне давялося ўжо пабываць некальскі разоў. Крыху разгублена ён вымавіў: «Вось елку вам прывёз з самай пушчы. Але калі яна вам не падабаецца, то прывязу іншую». Мы ў адзін голас закрычалі, што елачка прыгожая, іншай не трэба. А госць патаптаўся на месцы, нібы злёгку сумеўшыся, прадоўжыў: «Я тут яшчэ таго... мех бульбы прывёз. Падумаў: маладыя спецыялісты, мамкі — далёка». Тут ужо засаромелася я, стала гаварыць, што не варта было, нам неяк няёмка. А мае сяброўкі па пакоі хутка адцяснілі мяне назад і распарадзіліся: «Сюды, сюды, у куток стаўце».

Наш невясёлы настрой, прычынай якога, хутчэй за ўсё, былі туга па сталіцы, па студэнцкіх гадах, па сябрах-аднакурсніках, растаў сам сабой. Тэрмінова трэба было ўпрыгожваць елку. Цяпер цяжка паверыць, але ёлачныя ўпрыгажэнні таксама не прадаваліся на кожным кроку. Тады было вырашана камандзіраваць мяне ў магазін ваенгандлю. У раённым гарадку купіць мандарыны тады было верагодна толькі ў краме на тэрыторыі ваеннага гарадка. Туды вёў адзін шлях — праз КПП. А каб паставы салдат не спыніў і не папрасіў дакументы, неабходна было прайсці міма яго з выглядам ну амаль генеральскай жонкі. Такі артыстычны прыём я асвоіла ў першыя ж месяцы жыцця ў райцэнтры. Часам гэта выручала. Праўда, дэфіцытную садавіну і там «выкідвалі» толькі перад святам, але тым разам пашанцавала.

Хуценька нешта сабралі на стол. І свята наша, хоць і ў дзявочай кампаніі, атрымалася добрым і светлым. Яго ўпрыгожылі зялёна-мандарынавая ёлка і ўвага, па сутнасці, малазнаёмага чалавека, якой мы не чакалі. А калі не чакаеш чагосьці добрага, а цябе раптам парадуюць — удвая прыемна. Чаго і вам жадаю, дарагія чытачы, у святочныя дні.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# Гараскоп прычосак на студзень

**4 студзеня, субота.** Спрыяльны дзень для стварэння прычоскі. Яна, несумненна, будзе служыць вашым упрыгажэннем. Калі вы сёння пастрыжацеся, валасы могуць трошкі змяніць структуру, завіваючыся ў буйныя локаны.

**5 студзеня, нядзеля.** Сёння стрыжка валасоў раўназначная «адразанню» ад жыцця ўласнага поспеху, таму лепш з візітам у цырульню пачакаць.

**6 студзеня, панядзелак.** Зробленыя ў гэты дзень стрыжка ці прычоска зробяць ваша жыццё больш радасным.

**7 студзеня, аўторак.** Калі вы сёння пастрыжацеся, гэта можа прывесці да неспрыяльных наступстваў — павышэння вочнага ціску, запалення, абвастрэння хвароб вачэй. Можа пагоршыцца зрок.

**8 студзеня, серада.** Адпраўляцца сёння ў цырульню можна не толькі па новы імідж, але і па дабрабыт і поспех.

**9 студзеня, чацвер.** Калі верыць павер'ям Усходу, зробленая сёння стрыжка зробіць вас аб'ектам увагі злых духаў. Калі не жадаеце пагаршэння самаадчування і няўдач, не стрыжыцеся.

**10 студзеня, пятніца.** Сёння лепш не стрыгчыся, паколькі гэта можа выклікаць у вас галаўныя болі, прымусіць адчуваць беспрычынны страх; можа павялічыцца крывяны ціск.

**11 студзеня, субота.** Калі вы жадалі пастрыгчыся, зрабіце гэта сёння, бо дзень для гэтага надзвычай спрыяльны. Ваша аблічча зменіцца дзіўным чынам, што не застанецца без увагі блізкіх.

**12 студзеня, нядзеля.** Сёння будуць удалымі любыя маніпуляцыі з вашымі валасамі.

**13 студзеня, панядзелак.** Дзякуючы стрыжцы, зробленай сёння, вы станеце не толькі прыгажэйшымі, але і трохі больш удачлівымі.

**14 студзеня, аўторак.** Ваша інтуіцыя стане больш абвостранай, а розум — больш праніклівым, калі вы пастрыжацеся менавіта сёння.

**15 студзеня, серада.** Стрыжка, зробленая сёння, прывядзе да спрыяльных наступстваў — да паляпшэння здароўя, поспехаў у асабістым і дзелавым жыцці. Аднак усе гэтыя змены будуць адбывацца не адразу, а ў найбліжэйшыя месяцы.



**16 студзеня, чацвер.** Змена іміджу, зробленая ў гэты дзень, будзе вельмі карысная не толькі для вашай знешнасці, але і для матэрыяльнага дабрабыту.

**17 студзеня, пятніца.** Калі вы зробіце стрыжку менавіта сёння, гэта зменіць ваша жыццё ў лепшы бок, прычым ужо ў найбліжэйшыя месяцы гэтыя змены закрануць літаральна ўсе сферы.

**18 студзеня, субота.** Сённяшні візіт у салон прыгажосці будзе карысны, як гэта ні дзіўна на першы погляд, і для вашага духоўнага свету.

**19 студзеня, нядзеля.** Абавязкова схадзіце сёння ў цырульню, калі жадаеце, каб у вашым жыцці адбыліся пазітыўныя змены.

**20 студзеня, панядзелак.** Калі вы пастрыжацеся менавіта сёння, вам удасца сур'ёзна палепшыць сваё матэрыяльнае становішча.

**21 студзеня, аўторак.** Ад візіту ў цырульню сёння вельмі пажадана адмовіцца, паколькі стрыжка здольная наклікаць на вашу галаву шмат разнастайных жыццёвых няўдач.

**22 студзеня, серада.** Зрабіўшы сёння прычоску ці стрыжку, вы тым самым запросіце да сябе ў хату птушку поспеху.

**23 студзеня, чацвер.** Калі вы зацікаўлены ва ўзмацненні сваёй інтуіцыі і абвастрэнні розуму, схадзіце сёння ў цырульню і пастрыжыцеся.

**24 студзеня, пятніца.** Апроч новага — і вельмі ўдалага — іміджу, стрыжка, зробленая сёння, стане для вас крыніцай натхнення і поспеху.

**25 студзеня, субота.** Зробленая сёння стрыжка здольная прывесці да бязладзіцы. Паменшыцца самакантроль над эмацыйнай сферай, а цяга да благога, да алкаголю ўзмоцніцца.

**26 студзеня, нядзеля.** Гэта адзін з лепшых дзён месяца для стрыжкі. Дзякуючы ёй вы зменіце да лепшага не толькі знешнасць, але і прымножыце свае збераджэнні, а таксама звернеце на сябе ўвагу кіраўніцтва.

**27 студзеня, панядзелак.** Калі жадаеце выкупацца ў кампліментах і ўсіх літаральна зачараваць, сёння трэба абавязкова наведаць цырульніка.

**28 студзеня, аўторак.** Вельмі спрыяльны час для стрыжкі, якая, апроч іншага, зробіць ваша жыццё больш паспяховым.

**29 студзеня, серада.** Падстрыганне валасоў у гэты дзень дапаможа палепшыць матэрыяльнае становішча.

**30 студзеня, чацвер.** Дзякуючы сённяшняй стрыжцы ваш душэўны настрой палепшыцца. Акрамя таго, валасы пасля яе стануць трохі гусцейшымі.

**31 студзеня, пятніца.** Вы рызыкуеце адчуць сябе значна горш фізічна, калі пастрыжацеся і наогул распачняце любыя спробы палепшыць сваю знешнасць.



З 75-годдзем шчыра віншуем ветэрана працы, бацьку траіх дзяцей, дзядулю 6 унукаў і 3 праўнукаў, адданага падпісчыка «Звязды» **Яўгена Міхайлавіча ГАНЧАРОНКА** з вёскі Вязаўніца Асіповіцкага раёна!

*Жадаем здароўя,*
*удачы, дабра!*
*Хай кожны дзянёк*
*будзе ў свята!*
*Хай дом за вярсту*
*абыходзіць бяда,*
*А радасці будзе багата!*

## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СТУДЗЕНІ

**4, субота,** *13.00 — 19.00*
**6, панядзелак,** *4.00 — 19.00*
**8, серада,** *20.30 — 24.00*
**9, чацвер,** *0.00 — 4.30*
**11, субота,** *13.00 — 14.30*
**12, нядзеля,** *23.00 — 24.00*
**13, панядзелак,** *0.00 — 22.00*
**16, чацвер,** *7.00 — 15.00*
**18, субота,** *11.00 — 24.00*
**19, нядзеля,** *0.00 — 3.30*
**20, панядзелак,** *22.00 — 24.00*
**21, аўторак,** *0.00 — 14.30*
**23, чацвер,** *6.00 — 23.30*
**25, субота,** *16.00 — 24.00*
**26, нядзеля,** *0.00 — 5.00*
**27, панядзелак,** *23.00 — 24.00*
**28, аўторак,** *0.00 — 7.00*
**29, серада,** *19.00 — 24.00*
**30, чацвер,** *0.00 — 6.30*
**31, пятніца,** *18.00 — 22.30*

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Тыдзень насычаны шматлікімі падзеямі, якія запатрабуюць ад вас актыўнасці і вокамгненнай рэакцыі. Час праналізаваць, ці абгрунтаваны патрабаванні, якія вы прад'яўляеце да навакольных. З'явіцца выдатная магчымасць рэалізаваць творчыя здольнасці, але варта кантраляваць сваю раздражняльнасць і не правакаваць канфліктаў: яны могуць аказацца даволі доўгімі. У выхадныя дні займіцеся чым-небудзь карысным.

**ЦЯЛЕЦ.** З'явяцца новыя планы і ідэі, якія дазволяць рэалізаваць творчы патэнцыял. Ужо ў панядзелак займіцеся ўвасабленнем сваіх задум: калі ў іх ёсць хоць макулінка разумнага сэнсу, вы не пашкадуеце пра зробленае. Не варта дэманстраваць сваю ўнікальнасць і даказваць сваю незаменнасць — пасядзіце ціха. Хатнія справы ў выхадныя могуць адняць практычна ўвесь вольны час. Імкніцеся захоўваць спакой і выконваць толькі тыя абавязкі, якія сапраўды лічыце патрэбнымі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Рызыкуеце апынуцца ў цэнтры падзей: на вашай сціплай персоне будзе засяроджана ўвага навакольных. Пажадана падумаць над зменай іміджу. Вашы прафесійныя і арганізатарскія здольнасці будуць ацэнены пазітыўна. Менавіта вам давядзецца вырашаць жыццёва важныя пытанні. Ныць і адмаўляцца не варта. Поспех будзе спадарожнічаць людзям творчых прафесій.

**РАК.** Калі адпачынак ніяк не думае пачынацца, то ўсю ўвагу варта засяродзіць выключна на працоўных пытаннях. Пажадана прысвячаць сілы і час толькі тым задачам, якія вы ў стане вырашыць. Паспрабуйце не фарсіраваць падзеі, дазвольце ім плаўна цячы, і тады засяроджанасць дазволіць справіцца з пастаўленымі задачамі. У выхадныя вас можа ахапіць творчы парыў. Паспрабуйце ўвасобіць яго ў штосьці рэальнае.

**ЛЕЎ.** Пажадана сачыць за сваімі выказваннямі, інакш з'явіцца рызыка патрапіць у непрыемную сітуацыю. Можа спатрэбіцца дапамога сяброў, у адзіночку будзе складана справіцца з вялікім аб'ёмам працы. У сераду верагодныя добрыя навіны, злучаныя з перспектыўнымі прапановамі. У сярэдзіне тыдня не выключана пераразмеркаванне абавязкаў у працоўным калектыве, у выніку чаго асабіста вы можаце атрымаць не толькі большую самастойнасць, але і дадатковую адказнасць.

**ДЗЕВА.** Тыдзень спрыяльны для творчай актыўнасці. Паласа няўдач засталася ззаду. Можна радавацца і дзейнічаць, тым больш што вас перапаўняе творчая энергія. Пашырце свае гарызонты, навучыцеся чаму-небудзь новаму, тым навыкам, якіх вам вельмі не хапала. Калі вы сумуеце, магчыма, гэты тыдзень зменіць настрой. Абраны вамі кірунак можа з лёгкасцю змяніцца на процілеглы — сачыце за сабой.

**ШАЛІ.** Старанна аналізуйце падзеі, якія адбываюцца, абапіраючыся на жыццёвы досвед і логіку. Не падпарадкоўвайцеся чужой волі. Паспрабуйце ўстрымацца ад адкрытай крытыкі калег па працы. Магчымы кар'ерны ўзлёт і пераход на новую пасаду. Паспрабуйце пазбегнуць «зорнай» хваробы, не варта псаваць адносіны з навакольнымі. Наперадзе восьвось замаячыць штосьці новенькае, што абяцае вам сапраўдны поспех і паляпшэнне фінансавага становішча. Вашы планы могуць значна адрозніваццa ад задум сяброў — верагодныя канфлікты на гэтай глебе.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень спрыяльны для навучання. Асабліва добра будзе засвойвацца інфармацыя, якая мае дачыненне да павышэння кваліфікацыі ці наогул прафесійнага ўзроўню. У панядзелак ваш аўтарытэт можа выратаваць вельмі важная справа, будзьце гатовы ўзяць на сябе адказнасць. Не ўступайце ў дыскусіі, калі не да канца ўпэўнены ў сваёй слушнасці. У канцы тыдня падрыхтуйцеся да нечаканага прарыву ў справах. У суботу блізкім можа спатрэбіцца ваша дапамога.

**СТРАЛЕЦ.** Могуць з'явіцца новыя творчыя ідэі, якія хутка рэалізуюцца. Адносіны з калегамі наладзяцца, што створыць станоўчую атмасферу. Раптоўнае незапланаванае знаёмства можа стаць пачаткам плённага супрацоўніцтва. Паспрабуйце быць сумленнымі з сабой і навакольнымі, і тады ў пятніцу вы самі не станеце ахвярай падману. Будзьце асцярожнымі ў сераду: гэта неспрыяльны дзень для вас.

**КАЗЯРОГ.** Фартуна будзе ўсміхацца — можаце рызыкнуць адкрыць уласную справу. Толькі для гэтага, акрамя шанцавання, запатрабуецца нямала сіл і часу. Варта задумацца пра адпачынак. Калі ёсць такая магчымасць, то выберыце тур у экзатычную краіну — вы не пашкадуеце. У пятніцу вас будуць спакушаць прывабнымі прапановамі, ад якіх нялёгка будзе адмовіцца, але ўсё ж не давайце згоды адразу, падумайце. Ад начальства вы можаце не толькі пачуць словы пахвалы, але і атрымаць прэмію.

**ВАДАЛЕЙ.** Зможаце справіцца практычна з любой праблемай. Поспех будзе спадарожнічаць у творчых распачынаннях. Папоўніце кола зносін прыемнымі і карыснымі для вас людзьмі. Для паспяховай працы спатрэбіцца цярпенне, спакой і вытрымка. У сераду ўсё неабходна даводзіць да канца. У чацвер і пятніцу лепш не пачынаць ніякіх праектаў — завяршыце тое, што паспела назапасіцца. Верагодныя станоўчыя змены на працы.

**РЫБЫ.** Звядзіце да мінімуму кантакты з прадстаўнікамі падатковых і фінансавых органаў — гэта дапаможа пазбегнуць даволі буйных непрыемнасцяў. Верагодныя перапады настрою, якія могуць прывесці да творчага крызісу. Паспрабуйце не ідэалізаваць мінулае. Сустрэча са старымі сябрамі — гэта толькі даніна ўспамінам. Памятайце, што наперадзе вас чакаюць цікавыя і лёсавызначальныя сустрэчы.

Даты | Падзеі | Людзі



**1729** год — 285 гадоў таму нарадзіўся (вёска Ясянец, цяпер Баранавіцкі раён) Іахім Храптовіч, грамадска-палітычны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, філосаф, публіцыст, паэт і перакладчык. З 1765 года — маршалак галоўнага трыбунала ВКЛ, з 1773-га — падканцлер літоўскі, адзін з арганізатараў і членаў Адукацыйнай камісіі. Кіраўнік каралеўскай групоўкі магнатаў і шляхты ў Вялікім Княстве Літоўскім з 1780 г., міністр замежных спраў з 1791-га, канцлер ВКЛ з 1793 г. У сваіх маёнтках у Шчорсах і Вішнева замяніў паншчыну чыншам, пабудаваў у Шчорсах палац, школу, уніяцкую царкву, арганізаваў прыватную бібліятэку з архівам. Памёр у 1812 годзе.

**1869** год — нарадзіўся (вёска Добасна, цяпер Кіраўскі раён) Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі), беларускі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў новай беларускай прозы. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. У 1890-м за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях арыштаваны, выключаны з універсітэта. Пасля вяртання ў Беларусь працаваў у мястэчку Радашковічы, затым пераехаў з сям'ёй у фальварак Карпілаўка, дзе правёў большую частку жыцця. З 1909 года — у Вільні, працаваў у газетах «Наша ніва», «Беларус», часопісах «Саха», «Лучынка». Быў намеснікам старшыні Мінскага аддзела Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Бярозка», «Васількі», паэмы «Дзед Завала», кнігі «Успаміны», няскончанага рамана «Золата». Памёр у 1922 годзе.

**1959** год — 55 гадоў таму нарадзіўся (вёска Бадзені Мядзельскага раёна Мінскай вобласці) Мікола Віктаравіч Шабовіч, вядомы беларускі паэт, мовазнаўца, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1981 годзе скончыў філалагічны факультэт (беларускае аддзяленне) Мінскага дзяржаўнага педінстытута імя М. Горкага. Працаваў настаўнікам на Вілейшчыне. Пасля заканчэння аспірантуры выкладае родную мову ў Беларускім дзяржаўным педуніверсітэце імя М. Танка. Аўтар паэтычных зборнікаў «Дом» (1996), «Яшчэ пакуль не лістапад» (1996), «Падары мне сваю адзіноту» (2002), «Мая надзея» (2006), кнігі гумару «Хор болей не спявае», адзначанай рэспубліканскай літаратурнай прэміяй «Залаты Купідон» як лепшая кніга 2008 года ў намінацыі «Сатыра і гумар». Апошнім часам Мікола Шабовіч актыўна працуе як перакладчык. На яго вершы напісана больш як 170 песень.

### Было сказана

**Янка БРЫЛЬ, народны пісьменнік Беларусі:**

***«Добра і ў старасці быць маладым!»***

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

КАЛЯДНЫЯ ПАЧАСТУНКІ

## Пернікавы домік

**Для таго каб прыгатаваць пернікавы домік, вам спатрэбіцца пернікавае цеста, айсінг і шмат самых разнастайных прысмакаў. Напрыклад, можа спатрэбіцца печыва, шакалад, цукеркі тыпу мансье, марскіх каменьчыкаў, m & m's, мармелад, зефір, мармелад, арэхі, цукаты і ўсё, што прыйдзе ў галаву.**

### ПЕРНІКАВАЕ ЦЕСТА

Спатрэбіцца: *800 г мукі, 280 г цукровай пудры, 120 г мяккага маргарыну, 5 ст.л. растопленага мёду, 2 яйкі, 2 жаўткі, 2 ч.л. соды, 2 ч.л. прыправы для пернікаў (молатыя кардамон, мускатны арэх, гваздзіка, імбір).*



Змяшайце муку, цукровую пудру, соду і запраўу для пернікаў, зрабіце ў атрыманай сумесі ямку і дадайце мяккі маргарын, яйкі і мёд. Вымешваць да таго часу, пакуль не атрымаецца мяккае гладкае цеста. Калі спачатку можа падацца, што цеста атрымліваецца занадта пругкім, усё роўна працягвайце вымешваць. Калі ж сітуацыя не паляпшаецца, можна дадаць яшчэ адно яйка. Гатовае, добра вымешанае цеста загарніце ў харчовую плёнку і пакіньце на пару гадзін у халадзільніку. Праз 2 гадзіны з цеста можна фармаваць дэталі пернікавага доміка.

### АЙСІНГ

Спатрэбіцца: *1 яйка, 150 г цукровай пудры, дробка лімоннай кіслаты.*

Аддзяліце бялок ад жаўтка і ўзбіце бялок у пену. Прасейце цукровую пудру і паступова, пастаянна памешваючы, дадайце ўсю пудру да бялка. Дадайце лімонную кіслату і добра ўсё вымешайце. Павінна атрымацца пругкая бялковая сумесь. Калі неабходна, можна дадаць у яе харчовы фарбавальнік. Айсінг гатовы да выкарыстання.

Здавалася б, цеста гатова — можна прыступаць да падрыхтоўкі пернікавага доміка, але не ўсё так проста.

Для пачатку давядзецца прадставіць сябе сапраўдным будаўніком. Начарціце на паперы ці кардоне ўсе дэталі будучага доміка. Павінна атрымацца 4 сцяны і 2 дэталі даху, а таксама ніз, дзверы і вокны будучага доміка.

Калі ўсе дэталі будуць начэрчаны і выразаны, раскачайце цеста пластом 5 мм, прыкладзіце шаблон і з дапамогай вострага нажа выражце ўсе дэталі. Акуратна перанясіце іх на бляху і запячыце ў духоўцы пры тэмпературы 160-180 градусаў да румянай скарыначкі.

Можна адразу нарыхтаваць дэталі для некалькіх пернікавых домікаў, і няхай усе яны будуць зроблены па адным шаблоне, затое ўпрыгожыць іх можна рознымі спосабамі. Пасля таго як дэталі будуць гатовы, пакіньце іх на некаторы час, каб падсохлі. Тады сабраць пернікавы домік будзе нашмат прасцей.

Для ўпрыгожвання пернікавага доміка могуць падысці самыя розныя матэрыялы. Галоўная ўмова, каб яны былі ядомымі. Збіраць такую кампазіцыю лепш на шчыльным кардоне або плоскай талерцы. А можна спячы дадатковы корж з пернікавага цеста і размясціць усю кампазіцыю на ім. Добра вышаруйце блюда айсінгам, выкладзіце аснову хаткі, з дапамогай айсінгу прымацуйце сцены і злучыце іх паміж сабой. Каб дах мацней трымаўся, можна дадаткова замацаваць яго з дапамогай зубачыстак. Добра вышаруйце айсінгам усе стыкі. Нават калі атрымаецца не вельмі акуратна, нічога страшнага: заўсёды можна прысыпаць гэтае месца цукровай пудрай, і няхай ваш пернікавы домік выглядае як быццам прыцярушаны снегам. На гэтым этапе трэба даць айсінгу застыць, г.зн. пакінуць домік у спакоі ў сухім памяшканні як мінімум на ноч.

Калі домік падсох, можна прыступаць да ўпрыгожвання. Калі вы робіце пернікавы домік упершыню, то, магчыма, не варта налягаць на дробныя дэталі на самім доміку. Збярыце сам домік, з дапамогай айсінгу намалюйце вокны і прымацуйце дзверы. Не забудзьцеся зрабіць з айсінгу доўгія ледзяшы. Няўпрыгожаны дах можа сапсаваць увесь знешні выгляд, таму над ім давядзецца крыху папрацаваць. З дапамогай айсінгу і кандытарскага мяшка зрабіць узор, падобны на чарапіцу, і прымацаваць дробныя рознакаляровыя цукеркі. Стварэнне доміка — вельмі займальны працэс, які, напэўна, збярэ вакол усю сям'ю, а ваш дом напоўніцца дзівосным водарам свежых пернікаў.



# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.28 | 17.02 | 7.34 |
| Віцебск | — 9.24 | 16.44 | 7.20 |
| Магілёў | — 9.18 | 16.52 | 7.34 |
| Гомель | — 9.06 | 16.57 | 7.51 |
| Гродна | — 9.41 | 17.19 | 7.38 |
| Брэст | — 9.34 | 17.27 | 7.53 |

## Месяц

***Маладзік 1 студзеня. Месяц у сузор'і Рыбаў.***

## Імяніны

***Пр.** Настассі, Дзмітрыя, Фёдара.*
***К.** Альжбеты, Ангелікі, Рыгора, Тытуса, Яўгена.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

У падваротні:
— Цыгарэты ёсць?
— Не.
— А калі знайду?
— Значыць, трэнер па боксе дарма марнаваў на мяне час...

**Я адкрыла ў сабе жанчыну. Цяпер падкажыце, як закрыць яе назад.**
**У мяне няма такіх грошай і занадта маленькая шафа.**

Расія. Даішнік спыняе машыну:
— Чаму адна фара не гарыць?
— Новая мадэль — «Лада-Кутузаў».

**Дзеці, якім на навагоднім ранішніку падарылі толькі печыва і цукеркі, выклалі з гэтых прысмакаў слова «піць»!**




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.011. Індэкс 63850. Зак. № 54.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 3 студзеня 2014 года.